Цяжкасці росту «арганічных» фермераў

СТАР. 6

Ідзём на мароз. Без наступстваў

СТАР. 7

Убачыць Парыж і… расказаць іншым

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

24 СТУДЗЕНЯ 2014 г. ПЯТНІЦА № 13 (27623) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

НОВЫЯ КАДРАВЫЯ НАЗНАЧЭННІ

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ўчора разгледзеў кадравыя пытанні. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Кіраўнік дзяржавы назначыў:

РАЧКОВА Сяргея Анатольевіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Султанаце Аман і Алжырскай Народнай Дэмакратычнай Рэспубліцы па сумяшчальніцтве;

АСТРОЎСКАГА Аляксандра Пятровіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Каралеўстве Данія па сумяшчальніцтве.

Прэзідэнт таксама даў згоду на назначэнне:

КЛЕЦА Андрэя Анатольевіча — намеснікам старшыні Брэсцкага аблвыканкама;

ГАРАДЗЕЦКАГА Дзмітрыя Мікалаевіча — кіраўніком адміністрацыі Ленінскага раёна г. Брэста;

ТКАЧУКА Сяргея Анатольевіча — старшынёй Лоеўскага райвыканкама;

АГЕЙ Алены Аляксандраўны — намеснікам старшыні Гродзенскага аблвыканкама;

ТАРГОНСКАГА Алега Мечыслававіча — старшынёй Слонімскага райвыканкама;

ЯНЧЭЎСКАГА Андрэя Уладзіслававіча — старшынёй Слуцкага райвыканкама;

КІСЯЛЁВА Уладзіміра Аляксеевіча — першым намеснікам старшыні Магілёўскага аблвыканкама;

ОСІПАВА Аляксандра Васільевіча — старшынёй Бабруйскага райвыканкама;

БАЛТРУКОВІЧА Пятра Іванавіча — намеснікам старшыні Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях.

Назначаючы кіраўнікоў мясцовых выканаўчых органаў, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што, зыходзячы з прадстаўленых даных, пытанняў да іх прафесіяналізму і наяўнасці неабходнага вопыту работы з людзьмі няма. «Але трэба мець на ўвазе, што перыяд мы перажываем сур'ёзны. Аб гэтым ужо нямала сказана, у тым ліку мною. Не хачу перабольшваць тыя праблемы і складанасці, якія існуюць у эканоміцы, і чым яны абумоўлены. Але вельмі спадзяюся, што ў гэтым годзе мы будзем жыць значна лепш і здолеем пераадолець тыя негатыўныя тэндэнцыі, якія характэрны для нашай эканомікі, ды і не толькі для яе. Усё ў рэшце рэшт залежыць ад нас», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Паводле слоў Прэзідэнта, асаблівасць заключаецца яшчэ і ў маючых адбыцца значных выбарчых кампаніях, якія пачнуцца з выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў. «Гэта экзамен, мы гэта не скрываем, людзі нас будуць ацэньваць. Усе стрэлы будуць накіраваны, ведаеце ў каго, але ўсялякія беды і нягоды расхлёбваць, перш за ўсё, вам. Вы на перадавой, вы маеце стасункі з нашымі людзьмі. Менавіта яны будуць даваць ацэнку нашай рабоце. Таму я вельмі прашу вас гэты палітычны складальнік не скідаць з рахункаў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт таксама звярнуўся да пытання аб неабходнасці стварэння ў Беларусі нейкай палітычнай сілы ў выглядзе вядучай партыі. «Я ўжо неяк задаваў пытанне, можа, рытарычнае: можа, для больш паўнацэннага грамадска-палітычнага жыцця ў нашай краіне не хапае нейкай вядучай партыі? Усе краіны, асабліва вакол, постсавецкія рэспублікі такія партыі маюць. Мы — не. Я, шчыра кажучы, абсалютна быў бы не супраць, калі была б нейкая палітычная сіла, якая дапамагала б нам працаваць з кадрамі. Гэта вельмі сур'ёзнае пытанне. Усё вырашаюць людзі. Тут у нас вельмі шмат праблем, і тая сістэма, якая створана праз вертыкаль улады, безальтэрнатыўная. Няма канкурэнцыі. Гэта дрэнна», — лічыць беларускі лідар.

«На маё пытанне аб нейкай грамадска-палітычнай сіле, пачынаючы ад прэм'ер-міністра, кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, завяршаючы памочнікамі, гвалтам крычалі, што такая палітычная сіла сёння не патрэбна, усё ў руках старшынь гар-, райвыканкамаў, аблвыканкамаў. Таму стварацьнешта штучнае не трэба. Можа і так, але размова такая была, — прадоўжыў кіраўнік дзяржавы. — Лічу, што ў працэсе гэтых электаральных падзей, якія пройдуць у бліжэйшы час, нам трэба вельмі сур'ёзна заняцца гэтым пытаннем. Але гэта не значыць, што мы штучна створым нейкую партыю па ўзору КПСС. Вось гэта будзе ўжо зусім нядобра».

«Але я гэту размову распачаў для таго, каб вы маглі ўсё ж такі абаперціся на грамадскія арганізацыі, і такія арганізацыі ў краіне ёсць, на якія ўлада можа абаперціся ў гэтых электаральных працэсах. Яны вылучаюць і падтрымліваюць сваіх кандыдатаў, і гэта добра. Кажуць, што выбары ў мясцовыя Саветы — гэта рэпетыцыя парламенцкіх выбараў і нават прэзідэнцкіх. Добра, няхай будзе так. Давайце будзем рэпеціраваць, але так, каб была карысць для нашага народа. Не будзем нічога рабіць штучна. І я не проста вас прашу, а патрабую, каб ніякай штучнасці тут не было», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

«Давайце папрацуем так, як трэба, каб людзі нават думаць не маглі аб тым, што замест цяперашняй улады можа быць нейкая іншая. А што для гэтага трэба зрабіць, вы ўсе цудоўна разумееце: у будаўніцтве, ЖКГ, сельскай гаспадарцы, абароне чалавека, яго асноўных правоў на працу, дастойную зарплату, жыццё, бяспеку, іншых пытаннях. Вось тут давайце зробім па максімуме, і людзі нас заўсёды падтрымаюць. Таму гэты палітычны складальнік будзе вельмі важны ў бліжэйшы час у вашай рабоце. Але ўсё будзе нішто, калі не будзе працаваць эканоміка. Эканоміка — гэта фундамент», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

«Калі будуць развівацца прадпрыемствы, а эканоміка складваецца ў краіне з вынікаў работы канкрэтных прадпрыемстваў, паверце, будзе ўсё, і ўсе электаральныя цыклы мы пераможам. Таму з першага ж дня вам належыць неадкладна заняцца прадпрыемствамі, якія ўваходзяць у сферу вашай адказнасці. Асабліва старшыням гар-, райвыканкамаў і кіраўнікам адміністрацый у гарадах. Гэта зона вашай адказнасці. І не дзяліце яе ні з кім, усё роўна з вас будзе патрабавацца», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы таксама пракаменціраваў асобныя заявы, што кіраўнікі ў Беларусі, нібыта, баяцца прымаць рашэнні. Прэзідэнт падкрэсліў, што за памылку, якая не звязана з карупцыяй і асабістым інтарэсам, яшчэ ніхто нікога не пакараў. «Але калі ты нядрэнна працуеш, але недзе сабе на кішэнь — турма забяспечана. Таму простая логіка: дзейнічайце рашуча, трэба рызыкаваць — рызыкуйце, бачыце, што будзе за гэтай рызыкай дрэнна, — не рабіце, не бачыце — усё роўна спрабуйце, — заклікаў Прэзідэнт. — Час сёння такі, што трэба дзейнічаць. І гэта пустыя размовы аб тым, што хтосьці баіцца. Той, хто баіцца, павінен партфель пакласці і пайсці, так хоць атрымае нейкую нармальную, можа, работу. А калі цябе выганяць, працаўладкавацца ўжо вышэй, чым ты быў, і на кіруючую пасаду немагчыма. Таму трэба дзейнічаць».

ІНАВАЦЫЙНАЕ РАЗВІЦЦЁ — НА КАРЫСЦЬ ГРАМАДСТВА

Новы брэнд нацыянальнай скарбніцы навуковых ведаў

У Нацыянальнай акадэміі навук распачаліся святочныя мерапрыемствы, прымеркаваныя адначасова да дзвюх дат: 85-годдзя самой НАН Беларусі і Дня беларускай навукі. Удзел у святкаванні возьмуць больш за 500 вучоных з навуковых арганізацый СНД, краін Еўропы і Азіі: Азербайджана, Арменіі, Аўстрыі, Кітая, Літвы, Расіі, Украіны і іншых.

Адным з ганаровых гасцей стаў **віцэ-прэзідэнт Расійскай акадэміі навук, старшыня Санкт-Пецярбургскага навуковага цэнтра РАН, лаўрэат Нобелеўскай прэміі Жарэс АЛФЁРАЎ**. Ён даў сваю ацэнку сучаснаму стану навукі ў Беларусі: «Я заўжды вельмі высока ацэньваў беларускую навуку, можа быць, таму, што сам з'яўляюся яе часткай. З майго пункту гледжання, уся планета панесла велізарныя страты ад развалу Савецкага Саюза. І вельмі добра, што сёння беларуская эканоміка будуецца на платформе навуковых інавацый, як гэта было раней. Роля акадэміі навук у гэтым працэсе — вядучая».

Таксама акадэмік пацвердзіў сваё жаданне ўдзельнічаць у стварэнні першага беларускага Акадэмічнага ўніверсітэта. «Не трэба супрацьстаўляць традыцыйную ўніверсітэцкую адукацыю і акадэмічны ўніверсітэт, бо ў іх розныя мэты. Стварэнне такога ўніверсітэта дазволіла б Беларусі сканцэнтраваць свае намаганні на падрыхтоўцы вучоных да працы ў прарыўных напрамках, дзе беларусы могуць сказаць сваё слова». Такім прарыўным напрамкам, на думку Жарэса Алфёрава, з'яўляецца аб'яднанне медыцыны, біялогіі, тэхналогій дыягностыкі і інфармацыйных тэхналогій. На думку нобелеўскага лаўрэата, прымяненне беларускіх фізічных даследаванняў у сферы біялогіі мае вялікі патэнцыял.

На ўрачыстым адкрыцці пленарнага пасяджэння міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Навука — інавацыйнаму развіццю грамадства» выступіў **старшыня Прэзідыума НАН Уладзімір ГУСАКОЎ**. Менавіта фундаментальныя і прыкладныя даследаванні, па яго словах, павінны стаць брэндам НАН. У межах фундаментальных даследаванняў будуць развівацца нанатэхналогіі, касмічная сфера, распрацоўкі ў галіне фізікі, хіміі, матэматыкі. У прыкладных даследаваннях стаўка будзе рабіцца на машынабудаванне, аграрныя тэхналогіі, біятэхналогіі. Цяпер ствараецца кластар «БелБіяград», які будзе займацца навуковымі даследаваннямі і распрацоўкамі ў сферы біятэхналогій. У ім будзе пабудаваны «ланцуг» ад навуковых даследаванняў да арганізацыі вытворчасці.

Сярод буйнейшых беларускіх распрацовак апошняга часу Уладзімір Гусакоў вылучыў аграрныя (новыя гатункі некаторых культур, якія па сваіх якасцях пераўзыходзяць сусветныя эталоны), а таксама вынікі працы ў касмічнай сферы.

Пра міжнароднае навуковае супрацоўніцтва з Беларуссю расказаў **Антон НАВУМАВЕЦ, віцэ-прэзідэнт Нацыянальнай акадэміі навук Украіны**: «Яно мае вялікую гісторыю. Увогуле, можна вельмі доўга пералічваць сферы, у якіх мы супрацоўнічаем, але трэба імкнуцца да большага і не спыняцца на тым, што ёсць».

На першым паверсе галоўнага корпуса акадэміі пачала сваю працу выстава вынікаў інавацыйнай дзейнасці вучоных Акадэміі навук. Экспазіцыя складаецца з прыкладна 500 найноўшых тэхнічна-навуковых распрацовак беларускіх навукоўцаў, кніг вучоных-гуманітарыяў. На выставе можна ўбачыць практычна ўсе апошнія дасягненні НАН: ад здымкаў з беларускага касмічнага апарата да новых гатункаў бульбы і морквы.

Мерапрыемствы, прысвечаныя 85-годдзю НАН і Дню беларускай навукі, працягнуцца сёння.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.

Фота БЕЛТА.

ЛІЧБА ДНЯ

6 тыс. 170

участкаў для галасавання па выбарах у мясцовыя Саветы дэпутатаў створана ў краіне, паведамляе Цэнтрвыбаркам. Пры гэтым у санаторыях, прафілакторыях, дамах адпачынку, бальніцах і іншых арганізацыях аховы здароўя, якія аказваюць медыцынскую дапамогу ў стацыянарных умовах, утворана 269 участкаў, у вайсковых часцях — 39. Стварэнне ўчастковых выбарчых камісій павінна завяршыцца не пазней за 5 лютага ўключна. Падаць дакументы аб вылучэнні прадстаўнікоў у склад участковых выбарчых камісій неабходна не пазней, чым за тры дні да гэтай даты, гэта значыць да 2 лютага ўключна. Прапаноўваць свае кандыдатуры ва ўчастковыя камісіі маюць права палітычныя партыі, грамадскія аб'яднанні, працоўныя калектывы, грамадзяне шляхам падачы заяў.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.01.2014 г.

Долар ЗША	9590,00	■
Еўра	12990,00	▼
Рас. руб.	282,00	▼
Укр. грыўня	1137,60	▼

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	–15°
Віцебск	–14°
Гомель	–17°
Гродна	–14°
Магілёў	–16°
Мінск	–15°

■ Надвор'е

МАРАЗЫ — АМАЛЬ ДА МІНУС 30!

Арктычны холад чакае нас ужо ў выхадныя

Зіма працягвае гаспадарыць у нас па-сур'ёзнаму. І ў бліжэйшыя дні тэрыторыя Беларусі застанецца пад уплывам магутнага антыцыклону, сфарміраванага ў халодным арктычным паветры, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.

Даволі халоднае надвор'е прагназуюць сіноптыкі і ў пачатку наступнага тыдня. У панядзелак пераважна без ападкаў, толькі па паўднёвым захадзе кароткачасовы снег. Уначы на панядзелак — мінус 17-23, па паўночным усходзе — 24-27 марозу; удзень чакаецца мінус 11-16 градусаў. Пацяплення не трэба чакаць да сярэдзіны наступнага тыдня.

Сяргей КУРКАЧ.

Таму ў пятніцу чакаецца без істотных ападкаў. Максімальная тэмпература паветра ўдзень будзе вагацца ў межах 10-15 марозу, а ў асобных раёнах будзе дасягаць нават мінус 17 градусаў. Анамальна «буяніць» холад пачне ўжо на выхадныя. Ападкаў амаль не прагназуецца, толькі ў нядзелю месцамі па Брэсцкай вобласці магчымы кароткачасовы снег. Тэмпература паветра ўначы стане дасягаць мінус 17-23 градусаў, а ў асобных раёнах будзе зніжацца нават да 24-29 марозу. Маразы «пад мінус 30» чакаюцца ў бязветраных мясцінах у нізінах. Удзень чакаецца мінус 11-17 градусаў, і толькі па паўднёвым захадзе холад не будзе такім «злым».

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Будзь у курсе!

Заняткі спыніць толькі 25-градусны мароз

Рашэнні аб адмене заняткаў у школах у сувязі з моцнымі маразамі прымаюцца не Міністэрствам адукацыі, а мясцовымі ўладамі.

Як патлумачыла **прэс-сакратар галоўнага адукацыйнага ведамства Юлія ВАНІНА**, падставай для прыняцця такога рашэння можа стаць тэмпература паветра мінус 25 градусаў і ніжэй пры хуткасці ветру больш як 2 метры ў секунду. У першую чаргу заняткі спыняюцца ў пачатковай школе. Дашкольным установам у моцныя маразы не рэкамендуецца праводзіць прагулкі на свежым паветры, а заняткі спортам у школьнікаў павінны праходзіць толькі ў спартыўных залах.

У розных рэгіёнах Беларусі тэмпературны фон можа адрознівацца на 5—10 градусаў. У рэгіёнах, дзе тэмпература не апусціцца ніжэй за норму, заняткі ў школах адмяняцца не будуць.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ТОЛЬКІ ТРЭЦЬ РАСІЯН МАЮЦЬ ЗБЕРАЖЭННІ

Сацыёлагі высветлілі, што доля расіян, якія паведамляюць, што маюць зберажэнні, застаецца практычна нязменнай на працягу апошніх пяці гадоў. Гэта прыкладна трэць рэспандэнтаў (34%).

Адпаведна, амаль дзве трэці расіян (62%) не маюць зберажэнняў. Гэта перш за ўсё рэспандэнты з нізкім узроўнем даходу (79%) і моладзь ва ўзросце 18—24 гадоў (66%). Пры гэтым суму менш за 243 тыс. рублёў расіяне ў сярэднім зберажэннямі не лічаць. Кожны трэці рэспандэнт (35%) прызнаўся, што збіраецца рабіць зберажэнні ў бліжэйшы час. Часцей за іншых мяркуюць збіраць грошы масквічы і пецярбуржцы (42%). Больш за палову апытаных (57%) паведамілі, што не плануюць адкладаць грошы ў бліжэйшай будучыні.

6% апытаных не сталі б рабіць зберажэнні ні на якія мэты. У апытанні ўдзельнічалі 1600 чалавек са 130 населеных пунктаў у 42 абласцях, краях і рэспубліках Расіі.

ЧЫРВОНАЕ ВІНО, ШАКАЛАД І ТРУСКАЛКІ ПРАДУХІЛЯЮЦЬ РАЗВІЦЦЁ ДЫЯБЕТУ

Як было высветлена, флавоноіды, якія змяшчаюцца ў ягадах, рэгулююць узровень цукру ў крыві. Асабліва дапамагаюць злучэнні антацыяны. Іх, дарэчы, можна знайсці не толькі ў трускалках, але ў чорных парэчках, ажыне і чарніцах, і таксама ў шакаладзе і чырвоным віне. Супрацоўнікі Універсітэта Усходняй Англіі і Каралеўскага каледжа Лондана перакананы: актыўнае спажыванне прадуктаў, багатых гэтымі злучэннямі, звязана са зніжэннем паказчыкаў інсулінавай рэзістэнтнасці і з лепшым рэгуляваннем цукру. Плюс злучэнні здымаюць запаленне, якое можа пагражаць захворваннямі.

Эксперты праверылі гэтую тэорыю на прыкладзе амаль 2000 жанчын. Навукоўцы ацэньвалі аб'ём спажывання шасці падкласаў флаваноідаў. Потым аналізаваліся ўзоры крыві на прадмет рэгулявання цукру і запалення. Аказалася, актыўнае спажыванне антацыянаў і флавонаў найбольш эфектыўна зніжала рэзістэнтнасць да інсуліну. А вось высокі узровень спажывання антацыянаў сам па сабе змяншаў ўзровень хранічнага запалення, якое, дарэчы звязана не толькі з дыябетам, але запаленнем і хваробамі сэрца.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ЗША ПАГРАЖАЕ ТЭХНІЧНЫ ДЭФОЛТ

ЗША да канца лютага могуць апынуцца ў стане тэхнічнага дэфолту. Эканоміка і бізнес праз месяц вычарпаюць рэсурсы, неабходныя для выканання міжнародных фінансавых абавязацельстваў. Ужо ў кастрычніку 2013 дзярждоўг ЗША дасягнуў вызначанай законам мяжы на ўзроўні 16,7 трыльёна долараў. Міністр фінансаў Джэйкаб Лью заявіў, што «настойліва заклікае Кангрэс распачаць крокі па павышэнні мяжы дзяржаўнага доўгу, каб забяспечыць пэўнасць і стабільнасць эканомікі і фінансавых рынкаў».

Незалежныя эксперты папярэджвалі, што, калі праблема не будзе ўрэгулявана, на фінансавых рынках можа пачацца паніка, якая прывядзе да непрадказальных наступстваў для эканомікі не толькі ЗША, але і іншых краін. Як адзначала, у прыватнасці, дырэктар-распарадчыца МВФ Мішэль Лагард, амерыканскія дзяржаўныя казначэйскія абавязацельствы настолькі шырока ўкаранёны ва ўсе фінансавыя сектары, што ад іх устойлівасці залежыць становішча глабальнай эканомікі ў цэлым.

КАРАТКА

Хор хлопчыкаў са Светлагорскай школы мастацтваў запрошаны ў Сочы для ўдзелу ў культурнай праграме Паралімпійскіх гульняў.

Адзін працэнт насельніцтва Зямлі на сённяшні дзень валодае 46 працэнтамі сусветнага багацця.

Усяго на рэгістрацыю ініцыятыўных груп па зборы подпісаў выбаршчыкаў у падтрымку асоб, якія прапануюцца для вылучэння кандыдатамі ў дэпутаты мясцовых Саветаў, было пададзена 16 тыс. 66 заяў, 99,7 працэнта з іх задаволена. Адмоўлена ў рэгістрацыі 42 ініцыятыўным групам, адклікана 3 заявы.

Здымкі нацыянальнага кінапраекта «Авель» пачнуцца 28 студзеня. Аднымі з першых будуць зняты кадры дэманстрацыі, месцам дзеяння стануць Кастрычніцкая плошча, плошча Незалежнасці ў Мінску. Амаль 4 тыс. чалавек будуць заняты ў масоўцы.

Сусветны банк гатовы выдзеліць крэдыт на рэканструкцыю аўтадарогі М-6 Мінск-Гродна. Работы на аўтамагістралі ў напрамку Гродна плануецца пачаць у пачатку 2015 года.

VIII Чэмпіянат Еўропы па міні-футболе сярод ксяндзоў пройдзе ў Беларусі 24-28 лютага, яго сталіцай выбрана Ліда.

ІГРАЛЬНЫ БІЗНЕС ТРАПЛЯЕ ПАД СПЕЦЫЯЛЬНЫ РЭЖЫМ ПАДАТКААБКЛАДАННЯ

Пра асноўныя падатковыя навацыі і напрамкі далейшага ўдасканалення сістэмы падаткаабкладання ішла размова падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БЕЛТА, у якой прымалі ўдзел намесніца начальніка ўпраўлення падатковай палітыкі — начальніца аддзела падаткаабкладання даходаў Міністэрства фінансаў Надзея СУДНІК і намесніца начальніка ўпраўлення прамога падаткаабкладання галоўнага ўпраўлення метадалогіі падаткаабкладання арганізацый Міністэрства па падатках і зборах Наталля КАНДРАЦЕНКА.

Паляпшаем умовы вядзення бізнесу

Станоўчую дынаміку падатковых пераўтварэнняў адлюстроўвае прагрэс нашай краіны ў справаздачы Сусветнага банка «Вядзенне бізнесу-2014» па паказчыку «Падаткаабкладанне», расказвае Надзея Суднік. Згодна з гэтым рэйтынгам цяпер Беларусь займае 133 месца ў свеце (наша пазіцыя за год палепшылася ажно на 23 пункты, а ў параўнанні з ацэнкай 2008 года — на 45 пунктаў).

Падчас рэформы значна зніжана падатковая нагрузка на эканоміку. Яе паказчык (прапарцыянальнасць падатковых даходаў да ВУП) за апошнія пяць гадоў знізіўся на 8,9% (з 36,1% да ВУП у 2008 годзе да 27,2% у ацэнцы за 2013 г.). І сёлета прагназуецца зніжэнне такой нагрузкі яшчэ на 0,7%.

«Рулетку» — пад асаблівы кантроль

Наталля Кандраценка паведаміла, што сёлета падатковай галіной завершаны мерапрыемствы па стварэнні спецыяльнай камп'ютарнай касавай сістэмы (СККС), якая забяспечвае кантроль за абаротамі ў сферы ігральнага бізнесу. Летась з першых дзён снежня інфармацыя, якая фарміруецца СККС, бесперапынна актуалізуецца ў рэжыме рэальнага часу ў мэтах яе выкарыстання для кантролю за дзейнасцю ў сферы ігральнага бізнесу.

СТАР. 2

■ Парламенцкі дзённік

КАЛІ ВА ЎРАЧОЎ З'ЯВЯЦЦА АДВАКАТЫ?

Адным з найважнейшых паказчыкаў якасці жыцця ў краіне з'яўляецца ўзровень медыцынскага абслугоўвання. На ўчарашняй сустрэчы членаў Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў беларускага парламента па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і моладзевай палітыцы з прадстаўнікамі Славацкай урачэбнай палаты і грамадскага аб'яднання «Беларуская асацыяцыя ўрачоў» гутарка закранала як падабенствы і адрозненні сістэм аховы здароўя ў Беларусі і Славакіі, так і прававыя аспекты працы ўрачоў.

Валянцін МІЛАШЭЎСКІ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і моладзевай палітыцы, член рабочай групы ўрада па супрацоўніцтве з парламентам Славацкай Рэспублікі звярнуў увагу на тое, што з часоў Савецкага Саюза ў сістэме аховы здароўя Беларусі не адбылося значных змен. Аналагічныя сістэмы функцыянуюць у Вялікабрытаніі і Швецыі. Фінансаванне ідзе з рэспубліканскага бюджэту і размяркоўваецца па нарматыве на аднаго жыхара. У той жа час у нас ёсць платныя медыцынскія паслугі — як правіла, тыя, што не з'яўляюцца сацыяльнымі (ад іх не залежыць працягласць жыцця пацыента), напрыклад, пластычныя аперацыі.

Прэзідэнт Славацкай урачэбнай палаты Марыян КАЛАР адзначыў, што сёння ў Славакіі адбываецца пераход ад сацыялістычнай сістэмы аховы здароўя да сістэмы, дзе значную ролю хоча адыгрываць рынак. «Але бальніцы ніколі не будуць «таварам», а пацыент — «кліентам», — падкрэсліў Марыян Калар. У Славакіі кожны ўрач павінен рэгістравацца ў Славацкай урачэбнай палаце — гэта адзіная навукова-даследчая і прафесійная арганізацыя ўрачоў у краіне. Так, у палаце зарэгістравана 23 тысячы ўрачоў, з іх 14,5 тысячы з'яўляюцца яе членамі, якім аказваецца эканамічная і юрыдычная дапамога.

У Славакіі павышэнне кваліфікацыі абавязковае для кожнага ўрача, і гэта прапісана ў Законе. За кожныя 5 гадоў урач павінен атрымаць мінімум 250 «крэдытаў» (балаў, якія налічваюцца, напрыклад, за ўдзел у навуковых канферэнцыях, за публікацыю навуковых даследаванняў). У тых, хто жыве і працуе ў невялікіх населеных пунктах, натуральна, узнікалі праблемы з «крэдытамі», таму быў створаны спецыяльны партал Славацкай асацыяцыі ўрачоў. Там размясцілі свае навуковыя тэзісы больш чым 900 урачоў. Там жа яны могуць праходзіць дыдактычныя тэсты і атрымліваць за гэта неабходныя балы.

Як расказаў журналістам **Дзмітрый ШАЎЦОЎ, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, медыцынскай культуры, сямейнай і моладзевай палітыцы, старшыня Беларускай асацыяцыі ўрачоў,** гэтая сустрэча мае вельмі важнае значэнне. «Мы сустракаемся са Славацкай урачэбнай палатай для таго, каб даведацца, як праводзіцца ў іх заканадаўчая дзейнасць у галіне аховы здароўя, які ўплыў і якое значэнне маюць грамадскія арганізацыі ў заканатворчым працэсе, таксама для нас цікавыя пытанні прававой абароны ўрачоў», — падкрэсліў парламентарый. Ён акцэнтаваў увагу на тым, што ў Славакіі добра працуе сістэма прававой абароны ўрачоў. Іх інтарэсы прадстаўляюцца ў судзе на працэсах як адміністрацыйных, так і крымінальных. Кожны ўрач плаціць пэўны ўнёсак, і, калі ўзнікае неабходнасць, юрыдычная і адвакацкая дапамога прадастаўляецца яму бясплатна.

Па словах Шаўцова, пры Беларускай асацыяцыі ўрачоў ужо створана адвакацкая служба, якая займаецца непасрэдна прававой абаронай медыцынскіх работнікаў. «Праца над гэтым у нас пачалася не так даўно — крыху больш за паўгода таму, — паведаміў дэпутат. — Мне вядома, што ў Славацкай Рэспубліцы такая служба існуе ўжо не адзін год. Хацелася б даведацца, што яна з сябе ўяўляе».

У выніку сустрэчы быў заключаны дагавор аб супрацоўніцтве паміж Беларускай асацыяцыяй урачоў і Славацкай урачэбнай палатай з мэтай далейшай сумеснай працы дзеля ўмацавання сістэмы аховы здароўя.

Надзея ЮШКЕВІЧ

■ Пакланіцца святыні

УСЁ ПА ЗАДУМЕ БОЖАЙ...

Дары валхвоў заўтра накіруюцца ў Кіеў, нягледзячы на беспарадкі ва ўкраінскай сталіцы

На тэрмометры, што вісіць на Доме міласэрнасці, — з раніцы мінус сямнаццаць, а людзей, гатовых гадзінамі стаяць, каб пакланіцца святыні, не меншае. За дзень, паводле слоў Сяргея Хільмана, начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінгарвыканкама, у чарзе стаяць каля дваццаці тысяч чалавек. Як паведамілі ў Доме міласэрнасці, па стане на ўчарашнюю раніцу да Дароў валхвоў дакрануліся ўжо чатырыста тысяч вернікаў.

Сёння ў абед святыня накіруецца далей па запланаваным маршруце — у Кіеў. Пытанне аб тым, ці не перадумалі яе везці туды з-за беспарадкаў, якія зараз адбываюцца, цікавіла многіх і было першым на ўчарашняй прэс-канферэнцыі, падчас якой на пытанні беларускіх журналістаў адказвалі прадстаўнікі афонскай дэлегацыі, стараннямі якіх Дары валхвоў былі прывезены ў Мінск. Ніякіх змен у перамяшчэнні святыні не будзе, паведамілі прадстаўнік манастыра святога Паўла ў Свяшчэнным Кіноце Святой Гары Афон схімнах Нікадзім. «Украінская ўлада, улада суверэннай дзяржавы гарантавала поўную бяспеку, — зазначыў ён. — Спадзяёмся на Бога і на гарантыі, якія нам далі».

Зрэшты, хто ведае, можа, менавіта прыбыццё дароў у бушуючы Кіеў пакладзе пачатак усталяванню міру на ўкраінскай зямлі. І гэта будзе тым самым цудам, якога кожны з нас чакае ад вялікай святыні? «Гасподзь адзін ведае, каму, калі і праз што Ён можа паслаць зямны цуд», — гавораць насельнікі святой гары. Яны, напрыклад, лічаць цудам тое, што замест абяцанай мяцеліцы ўвесь час, колькі Дары знаходзяцца ў Мінску, свеціць сонца (і як можна з імі спрачацца, калі ў прагнозах сіноптыкаў і ў сераду, і ў чацвер значыўся снегапад?). Ды і ў Маскве, пакуль святыня там знаходзілася, было надзіва цёплае для студзеня надвор'е, а як толькі яе перавезлі ў Санкт-Пецярбург, у сталіцы пачалася завея, а пасля рэзка пахаладала.

Наогул, як расказаў ігумен манастыра святога Паўла архімандрыт Парфеній (ён, дарэчы, жыве на Афоне з 1954 года і ўжо сорак гадоў узначальвае манастыр) шлях дароў да нашых зямель быў няпросты. Іх упершыню за пяцісотгадовую гісторыю вывезлі з Грэцыі. Там, у межах мітраполіі, іх вывозяць час ад часу, задавальняючы просьбы прыходаў. Прычым, падкрэсліваюць манахі, гэта ніколі не адбываецца па ініцыятыве саміх святагорцаў — толькі па просьбе вернікаў і іх пастыраў. Менавіта такая просьба паступіла два гады назад на Афон ад Патрыярха Маскоўскага і Усяе Русі Кірыла. Увесь наступны час афармляліся адпаведныя дакументы, было атрымана блаславенне ад Усяленскага патрыярха і ад Свяшчэннага Кінота святой гары Афон — працэс вывазу святынь за межы Грэцыі нашмат больш складаны.

«Але, нават калі ўсе дазволы былі атрыманы, нас не пакідалі сумненні, — дзеліцца настаяцель. — У Грэцыі ўсе з дзяцінства ведаюць пра надзвычай суровую рускую зіму. І калі на Афон прыехаў прадстаўнік Маскоўскай патрыярхіі, каб удакладніць дэталі паездкі, мы з ім гэтымі сумненнямі падзяліліся: можа, перанесці тэрмін знаходжання святыні на вашых землях на вясну, пасля Вялікадня? Але служыцель РПЦ нас запэўніў, што вашы людзі прывычныя і да снегу, і да холаду, і гэта толькі ўзмоцніць іх жаданне дакрануцца да дароў. Так яно і атрымалася. І мы дзякуем за тое Богу, бо нічога не бывае выпадковым, усё робіцца па задуме Божай. Мы паедзем з Мінска, гэтак жа, як і з Масквы, і з Санкт-Пецярбурга, з самымі лепшымі ўражаннямі, успамінаючы цяпло і любоў, з якімі нас тут прымалі...»

Не абышлі ўвагай журналісты і пытанне аб сапраўднасці дароў: вядома, што некаторыя навукоўцы ставяць яе пад сумненне. Адказ схіманаха Нікадзіма быў адназначны: у насельнікаў Афона такіх сумненняў няма. На святой гары захавалася шмат рэліквій хрысціянства, якія, як уяўляецца многім людзям, захавацца за тысячагоддзі проста не маглі. Але з Божай дапамогай яны захаваліся, гаворыць схіманах. «Мы не лічым патрэбным праводзіць навуковую экспертызу, якая б пацвердзіла сапраўднасць дароў, бо сама святыня шматлікімі Божымі цудамі, якія праз яе здзяйсняюцца, пацвярджае гэта».

Ці былі зафіксаваныя цуды або ацаленні каля Дароў, пакуль яны знаходзяцца ў Мінску? Святагорцы на гэта пытанне не адказалі: такія рэчы становяцца вядомымі праз некалькі дзён. У Маскве, як расказалі манахі, назіралася некалькі выпадкаў вар'явання, што і нядзіўна: вядома, што дары асабліва ўплываюць на людзей апантаных. «Галоўная перашкода для цудаў — наша нявер'е»,— сцвярджаюць святыя айцы, пры гэтым дадаючы, што не ўсе цуды бачныя, яны могуць адбывацца ў нашай свядомасці і ў нашай душы.

Ці прывязуць яшчэ якую-небудзь святыню да нас з Афона і якую менавіта? На гэты конт на святой гары планаў не строяць, цвёрда ведаючы: усё па задуме Божай. Затое архімандрыт Парфеній паабяцаў іншае: «Мы будзем маліцца апякунцы Афона Багародзіцы за вашу святую зямлю»...

Алена ЛЯЎКОВІЧ

НАВІНЫ

КАБ БЯЗДОМНЫЯ НЕ ЗАМЕРЗЛІ

У сувязі з надыходам моцных маразоў у Віцебску запрацаваў перасоўны пункт для аказання дапамогі бяздомным.

— Ён прыязджае ў месцы, дзе збіраюцца бяздомныя. Тут яны могуць выпіць гарбаты, атрымаць прадукты, гігіенічныя наборы, а таксама цёплыя рэчы, — паведамілі «Звяздзе» ў Віцебскай абласной арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа.

Гараджане могуць прынесці зімовы абутак, курткі, шапкі, штаны, пальчаткі і іншае ў тры пункты прыёму рэчаў, арганізаваныя пры раённых арганізацыях Чырвонага Крыжа. Падарункі неабыякавых людзей абавязкова будуць перададзены тым, хто замярзае на вуліцы.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ПРЫЙШЛІ НА ВЫРУЧКУ ПАЛОМНІКАМ

Увечары ў Дзяржынскім раёне дапамога выратавальнікаў спатрэбілася паломнікам з Кобрына.

Тут на трасе М1 каля вёскі Крысава зламаўся аўтобус «Неаплан», які перавозіў людзей. Яны вырталіся пасля пакланення святыні — Дарам валхвоў. Тэмпература на вуліцы набліжалася да мінус 15 градусаў, а сярод 55 паломнікаў было ў тым ліку і чацвёра дзяцей...

— Была задзейнічана раённая сістэма папярэджвання і ліквідацыі надзвычайных здарэнняў. Да работы, акрамя нашых выратавальнікаў, падключыліся прадстаўнікі аддзела адукацыі і дзяржынскага аўтапарка, — распавялі ў Мінскім абласным упраўленні МНС. — Да прыбыцця з яго аўтобуса людзей часова размясцілі ў аграрна-тэхнічным прафесійным ліцэі ў Дзяржынску. Прыкладна без чвэрці апоўначы аўтобус з паломнікамі выехаў у Кобрын.

Сяргей РАСОЛЬКА.

СМЕРЦЬ ПАД КОЛАМІ

Трагедыя на дарозе здарылася з 64-гадовым пенсіянерам, які пераходзіў вуліцу Чалюскінцаў у Магілёве па нерэгуляваным пешаходным пераходзе.

Сярод белага дня яго збіў аўтобус, прычыніўшы смяротную траўму. Прычына ДТЗ устанаўліваецца. Але, як паведаміла інспектар аддзялення абласнога ўпраўлення ДАІ Таццяна Старасотнікава, да няшчасных выпадкаў часцей за ўсё вядуць парушэнні правілаў дарожнага руху як вадзіцелямі, якія павінны скідаць хуткасць каля пешаходных пераходаў, так і самімі пешаходамі, якія кранаюцца з месца не пераканаўшыся ў тым, што няма небяспекі.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

СМІ ТРЭБА ПАВАЖАЦЬ

На Віцебшчыне за нясвоечасовае рэагаванне на крытыку ў СМІ летась пакаралі больш як дваццаць адказных асоб.

— Усяго па выяўленых Камітэтам дзяржкантролю Віцебскай вобласці фактах парушэнняў патрабаванняў Указа Прэзідэнта № 630 «Аб рэагаванні службовых асоб на крытычныя выступленні ў дзяржаўных сродках масавай інфармацыі» прыцягнулі да дысцыплінарнай адказнасці 22 службовыя асобы, — паведамілі ў кантрольным ведамстве. Сярод вінаватых — кіраўнікі сельскагаспадарчых, дарожна-будаўнічай арганізацый, упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Лёзненскага райвыканкама і іншыя чыноўнікі.

«Рэкардсменам» стала кіраўніцтва адной з гаспадарак Дубровенскага раёна, якое на 129 дзён пазней, чым трэба, адказала на крытыку ў мясцовай раённай газеце.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

СЛУЖЫЦЬ ТРЭБА БЕЗ КОМПЛЕКСАЎ

Рэспубліканскі цэнтр праблем чалавека БДУ распрацаваў новы апаратна-праграмны комплекс для дыягностыкі прафесійна-псіхалагічнай прыдатнасці супрацоўнікаў МУС.

Гэты комплекс прызначаны для дыягностыкі і даследавання нейрапсіхалагічных, псіхафізіялагічных і сацыяльна-асабовых якасцяў вайскоўцаў, якія забяспечваюць нацыянальна-дзяржаўную бяспеку і ахоўваюць папраўчыя калоніі, спецыяльныя грузы, асабліва важныя дзяржаўныя аб'екты.

Праца над стварэннем апаратна-праграмнага комплексу доўжылася цягам двух гадоў. На сёння ён прайшоў паспяховую апрабацыю на асабовым саставе ўнутраных войскаў, падчас якой было пратэсціравана звыш 200 вайскоўцаў, якія праходзяць службу па кантракце ў папраўчых калоніях. У бліжэйшы час новая распрацоўка цэнтра БДУ будзе выкарыстоўвацца структурамі МУС, а іх штатныя псіхолагі пройдуць навучанне работе з комплексам. Ён, дарэчы, ужо атрымаў высокую ацэнку.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ФАКТЫ

БАБУЛЯ З УНУЧКАЙ ЗАГІНУЛІ...

Непрафесійная замена газавага балона прывяла да гібелі двух чалавек.

— Трагедыя адбылася а першай гадзіне дня ў вёсцы Ваўкавічы Талачынскага раёна. 46-гадовы мужчына прыйшоў замяніць газавы балон у доме пажылой жанчыны. Яна паказала, дзе знаходзіцца балон, а сама з 5-гадовай унучкай пайшла ў дом. Мужчына замяніў балон і вырашыў праверыць з дапамогай запалкі герметычнасць злучэння газавага балона і пліты. У гэты момант адбылася ўспышка газу, і яго выкінула на вуліцу, — паведаміла «Звяздзе» Марына Фандо, прэс-сакратар Віцебскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях. Калі мужчына апрытомнеў, дом ужо гарэў. Віноўнік здарэння атрымаў апёкі твару і рук 2-й ступені. Бабуля з унучкай выйсці з вогненнага дома не змаглі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ІГРАЛЬНЫ БІЗНЕС ТРАПЛЯЕ ПАД СПЕЦЫЯЛЬНЫ РЭЖЫМ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Было праведзена падключэнне да СККС гульнявых аўтаматаў, кас букмекерскіх кантор і таталізатараў. У ігральных установах з'явіліся спецыяльныя касавыя тэрміналы, якія дазваляюць кантраляваць фактычны прыём і выплату наяўных грашовых сродкаў удзельнікам азартных гульняў.

З улікам уводу СККС у эксплуатацыю, сёлета прадугледжана змена асаблівага рэжыму падаткаабкладання — падатку на ігральны бізнес. У прыватнасці, пашыраецца падатковая база гэтага падатку за кошт увядзення дадатковага аб'екта падаткаабкладання — станоўчай розніцы паміж сумай прынятых ставак і сумай выплачаных выйгрышаў. Стаўка падатку на ігральны бізнес па гэтым аб'екце падаткаабкладання вызначаецца ў памеры 4%.

У сувязі з тым, што ў дачыненні да ігральнага аўтамата, ігральнага стала, касы букмекерскай канторы і касы таталізатара ўстаноўлены фіксаваныя стаўкі падатку, падатковая база вызначаецца асобна для гэтых аб'ектаў падаткаабкладання і спецыяльна для станоўчай розніцы паміж сумай прынятых ставак у азартных гульнях і сумай выплачаных выйгрышаў. У мэтах аднолькавага прымянення нормаў Падатковага кодэкса сёння канкрэтызавана паняцце розніцы паміж сумай прынятых ставак і сумай выплачаных выйгрышаў у азартных гульнях у дачыненні да кожнай з разнавіднасцяў азартных гульняў. Гэта дазволеныя ў Беларусі віды (гульня ў карты, у косці, цыліндрычная гульня (рулетка), гульня на ігральных аўтаматах, таталізатар і букмекерская гульня).

Цяпер для арганізатараў, якія выкарыстоўваюць электронныя ігральныя сталы, што маюць тэхнічную магчымасць падключэння да СККС, з 1 студзеня прадугледжваецца паніжэнне ў два разы стаўкі падатку на ігральны бізнес у фіксаванай суме. Чакаецца, што гэта будзе стымуляваць уладальнікаў такога бізнесу да замены традыцыйных сталоў на электронныя, якія можна кантраляваць з выкарыстаннем СККС.

Электронныя дэкларацыі

Спадарыня Кандраценка адзначыла, што падаваць дэкларацыі ў падатковую інспекцыю ў электронным выглядзе з гэтага года абавязаны ўсе плацельшчыкі ПДВ у Беларусі. Новаўвядзенне накіравана на ўдасканаленне падатковага адміністравання і аптымізацыю выдаткаў на яго правядзенне.

Сёлета ў дачыненні да тавараў, што ўвезены у Беларусь з дзяржаў — членаў Мытнага саюза без неабходных дакументаў, плацельшчыкі адзінага падатку абавязаны забяспечыць наяўнасць першасных уліковых дакументаў.

Паколькі паміж уступленнем у сілу адпаведных змяненняў у Падатковым кодэксе і тэрмінамі здачы падатковых дэкларацый у студзені прайшло няшмат часу, то да падключэння да сістэмы электроннага дэкларавання (СЭД) плацельшчыкі ПДВ маюць права накіроўваць у падатковы орган падатковыя дэкларацыі (разлікі) і на папяровым носьбіце. Адміністрацыйная адказнасць у гэтым выпадку не прадугледжваецца.

Сістэма электроннага дэкларавання функцыянуе ў рэспубліцы ўжо пяць гадоў. Яе выкарыстанне дазваляе палегчыць для плацельшчыкаў працэс складання падатковых дэкларацый, што значна скарачае іх часавыя і матэрыяльныя выдаткі, у тым ліку на наведванне падатковага органа. Акрамя таго, аўтаматызаваны кантроль дакладнасці запаўнення паказчыкаў падатковых дэкларацый дазваляе пазбегнуць памылак, якія могуць выклікаць прыцягненне плацельшчыка да адміністрацыйнай адказнасці за нявыплату падаткаў.

Асобна нагадаю, што сэрвіс «Электронная прыёмная» дазваляе дыстанцыйна запісацца на прыём да кіраўніцтва падатковага органа, а Цэнтр электроннага інфармавання прызначаны для ініцыятыўнага накіравання паведамленняў на электронныя адрасы плацельшчыкаў праз інтэрнэт.

У падатковых органах арганізаваны кансультацыі па пытаннях установкі, наладкі і функцыянавання праграмных сродкаў СЭД і абсталяваны спецыяльныя навучальныя месцы. Акрамя таго, супрацоўнікі падатковых органаў аказваюць практычную дапамогу пры складанні і накіраванні падатковых дэкларацый. Ужо сёння, ацаніўшы перавагу СЭД, яе выкарыстоўваюць больш за 148 тысяч плацельшчыкаў, у тым ліку больш за 81 тысячу арганізацый і 67 тысяч індывідуальных прадпрымальнікаў. Пры гэтым толькі летась іх колькасць павялічылася больш чым на 42 тысячы, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў — на 28 тысяч чалавек.

Падатак і нерухомасць

З першых дзён года істотна пашыраецца паняцце «капітальнай пабудовы (будынка, збудавання)» для мэт вызначэння аб'екта падаткаабкладання падаткам на нерухомасць. Летась падаткам на нерухомасць на прадпрыемствах абкладаліся аб'екты, якія адносяцца да капітальных пабудоў у адпаведнасці з Законам «Аб дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй». Цяпер да капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў) залічаны і іншыя аб'екты, якія класіфікуюцца як будынкі і збудаванні ў адпаведнасці з заканадаўствам (аб'екты, якія з'яўляюцца будынкамі, збудаваннямі, але не падлягаюць дзяржаўнай рэгістрацыі).

Адзіны падатак для прадпрымальнікаў

Наталля Кандраценка паведаміла, што цяпер для такіх падаткаплацельшчыкаў удакладнены пералік дакументаў, якія пацвярджаюць набыццё (паступленне) тавараў, набытых на тэрыторыі дзяржаў — членаў Мытнага саюза. Такімі дакументамі з'яўляюцца: дагаворы, на падставе якіх тавары ўвозяцца ў Беларусь з гэтых дзяржаў, транспартныя (таварасуправаджальныя) дакументы, якія пацвярджаюць іх рух, рахункі-фактуры падаткаплацельшчыкаў дзяржаў — членаў Мытнага саюза. Толькі пры наяўнасці гэтых дакументаў індывідуальныя прадпрымальнікі пры вылічэнні адзінага падатку не ўжываюць каэфіцыент, большы за 2. Падобныя дакументы таксама з'яўляюцца падставай для пераходу індывідуальных прадпрымальнікаў — плацельшчыкаў адзінага падатку, што ажыццяўляюць рознічны гандаль, на іншыя рэжымы падаткаабкладання.

Акрамя таго, сёлета ў дачыненні да тавараў, што ўвезены у Беларусь з дзяржаў — членаў Мытнага саюза без неабходных дакументаў, плацельшчыкі адзінага падатку абавязаны забяспечыць наяўнасць першасных уліковых дакументаў (іх формы зацвярджаюцца ўпаўнаважанымі дзяржорганамі) пры захоўванні тавараў у крамах, іншых месцах, а таксама пры іх адпраўцы з месцаў захоўвання ў месцы рэалізацыі.

Падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.

■ Погляд

УКРАІНСКАЯ ДРАМА ЯК СТРАТА ІЛЮЗІЙ

«Звязда» папрасіла пракаментаваць сітуацыю, якая склалася ва Украіне, палітолага, доктара гістарычных навук, прафесара Алега БУХАЎЦА.

— Па-першае, у постсавецкае плаванне дзяржава пад назвай Украіна пусцілася не з той лоцыяй, з якой яна магла б захоўваць куды больш устойлівыя тэмпы развіцця і куды больш грунтоўна будаваць украінскую дзяржаўнасць.

У свой час заходнееўрапейскія спецыялісты думалі, што для постсавецкай прасторы нацыя — гэта тая свяшчэнная пасудзіна грамадзянскай свабоды, якая дапаможа адысці ад таталітарнага мінулага. Але на ўкраінскім прыкладзе, калі краіна этнакультурна, гісторыка-цывілізацыйна вельмі разнародная, гэта адыграла ролю закладзенай пад будынак украінскай нацыі выбуховай прылады. Да выканання была прынята мадэль пабудовы этнакультурнай нацыі. У адпаведнасці з ёй неўкраінцам, якіх вельмі шмат (асабліва рускіх, ды і беларусаў — больш за 400 тысяч), трэба было асімілявацца, гэта значыць стаць у этнакультурных адносінах украінцамі, каб атрымаць статус члена ўкраінскай нацыі.

Паколькі Украіна для нас не толькі сястра і суседка, але і дзяржава, з якой агульная мяжа складае амаль 1100 кіламетраў, усё, што там адбываецца, вельмі нас хвалюе. Натуральна, што і прэс-сакратар расійскага прэзідэнта з заклапочанасцю казаў пра ўкраінскі крызіс.

У адрозненне ад Украіны, у нас мадэль грамадзянска-палітычнай нацыі. Гэта значыць, што незалежна ад таго, што я — этнічны беларус, а вы — этнічная руская, мы абое — паўнапраўныя члены беларускай нацыі. Безумоўна, у нас ёсць нацыянальна-адраджэнскі напрамак, але ён не адлюстроўвае вялікі спектр грамадскай свядомасці. Масавая свядомасць Беларусі не рэагуе на тое, што так расхіствае ўкраінскую нацыю.

Там, акрамя трох абласцей, якія заўсёды выконваюць ролю лакаматыва ў механізмах дэстабілізацыі, — Львоўская, Івана-Франкоўская і Цярнопальская, ёсць куды больш шматлікая частка Украіны — усходняя, паўднёва-ўсходняя і паўднёвая Украіна. З пункту гледжання «заходнікаў» жыхары гэтай часткі не з'яўляюцца паўнавартаснымі ўкраінцамі, бо яны рускамоўныя. Досвед Беларусі паказвае, што пераважная рускамоўнасць не пазбаўляе нас беларускай ідэнтычнасці.

Па-другое (і гэта, на мой погляд, вельмі істотна), постсавецкае развіццё Украіны пайшло па шляху алігархізацыі эканомікі. Калі найбольш важкія і тлустыя кавалкі дзяржаўнай уласнасці пераходзілі ў рукі тых, хто быў блізкі да ўлады, у выніку ўтварыліся цэлыя кланы. Таму ва Украіне індэксы сацыяльнага расслаення куды больш праблемныя для ўстойлівага развіцця, чым у той жа Беларусі.

Больш за тое, Украіна, на мой погляд, вельмі неабдумана зрабіла, калі, уступіўшы ў Сусветную гандлёвую арганізацыю, не стала праводзіць моцную і зразумелую эканамічную палітыку. Кітай, напрыклад, 20 гадоў рыхтаваўся, уступіў у СГА і толькі выйграў ад гэтага. Цікава, што ў камуністычны Кітай заходні бізнес рынуўся, нібы ласось на нераст. Бо ўлада там прадказальная, выклікае давер у прадпрымальнікаў. А ва Украіне за 4 гады яе членства ў СГА сектар паслуг вырас да 60 працэнтаў ва ўсёй эканоміцы. І добра было б, калі б ён быў падобны да галандскага, але тут сектар паслуг раздзімаецца толькі за кошт таго, што вядучыя раней галіны індустрыі не вытрымліваюць канкурэнцыі. У савецкія часы Украіна была другой па эканамічнай вазе саюзнай рэспублікай, а цяпер там адбылося скурчванне рэальнага сектара.

За апошнія 10 гадоў з-за алігархічнай мадэлі, з-за вельмі некамфортнага этнакультурнага клімату 10% насельніцтва адтуль выехала. Цяпер беспрацоўе складае тыя ж 10 працэнтаў! Гэта вельмі шмат для эканомікі краіны з пераддэфолтным рэйтынгам. Дапамога Расіі магла б выправіць сітуацыю, але тут умяшалася чыстая палітыка і довады апазіцыйнай да цяперашняй улады часткі ўкраінскага палітычнага істэблішменту. Яна называе сябе праеўрапейскай, а насамрэч яна праеўрасаюзная, бо шчыра паўтарае самую распаўсюджаную памылку пра «еўрапейскі выбар». Але ж Украіна — еўрапейская дзяржава. Недарэчнае атаясамліванне цэлага (Еўропы) з часткай — Еўрасаюзам — адлюстроўваецца і ў рыторыцы апазіцыі.

Публіцыст Максім Шаўчэнка сказаў, што вялізную ролю ў пазіцыі тых, хто ініцыяваў акцыі пратэсту, адыгрываюць моцныя грантавыя адлічэнні Еўрасаюза і ЗША. Украіну там разглядаюць як ключавое звяно, кантроль над развіццём якога павінен застрахаваць ад рэінтэграцыі пад кіраўніцтвам Расіі. Вядома, ільвіная доля гэтых грантаў спажываецца дарэмна. Але калі ў краіне 10 працэнтаў беспрацоўных, то можна мабілізаваць дастатковую колькасць незадаволеных. Для горада ў 2,5 мільёна жыхароў некалькі дзясяткаў, нават 100 тысяч чалавек — далёка не сцэльны пратэст, але гэтыя дзясяткі тысяч забяспечваюць агульны фон трывожных чаканняў — **КУДЫ ПОЙДЗЕ УКРАІНА?**

Сёння на нашых вачах разгортваецца драма, калі «львы рыкаючыя» Майдана — перш за ўсё Віталь Клічко, Арсеній Яцанюк і Алег Цягнібок — страцілі кантроль над масоўкай з яе нацысцкімі лозунгамі. Дарэчы, калі міністр замежных спраў Германіі, цяпер былы, прыйшоў на Майдан, ён казаў пра гэтыя сцягі і лозунгі: «Прыбярыце, у Германіі паліцыя за такое адразу б арыштавала».

Думаю, што неўтаймаваная стыхія ўжо запушчана на арбіту. І тыя, хто лічаць сябе яе павадырамі, зусім нядаўна былі ў разгубленасці. Бо масоўка значна больш радыкальна настроеная, чым яе лідары. Гэта энергія, якую, як джына з бутэлькі, калі выпусціш, то назад не ўціснеш.

А Заходняя Еўропа і Злучаныя Штаты вядуць палітыку, якая б'е ўсе рэкорды крывадушнасці. Ёсць вельмі вядомая формула Оруэла: у прынцыпе, усе роўныя, але некаторыя больш роўныя. Еўрасаюз якраз гэта і дэманструе. Ён гатовы мірыцца нават з нацысцкімі воклічамі Майдана, толькі б было горш Расіі. І калі Расію абвінавачваюць ва ўмяшанні, а высокія службовыя асобы Еўрасаюза выступаюць з прамовамі на барыкадах, то як гэта назваць?

Тут мы павінны зрабіць высновы. Мы, вядома, ушаноўваем свяшчэнныя камяні Еўропы, але надышоў час адмовіцца ад ілюзій, што Еўрасаюз успрымае нас як роўных. Ён успрымае нас як менш роўных.

Цяпер Еўрасаюз паведаміў пра санкцыі ў сувязі з загінулымі, але як людзі могуць не загінуць у такім пекле? І ніхто не кажа пра адказнасць лідараў апазіцыі. У той жа Германіі, Францыі пры акцыях пратэсту, якія суправаджаюцца пагромамі і падпаламі, паліцыя не цырымоніцца і не дазваляе з'яўляцца на вуліцах гарадоў у масках і шлемах.

Думаю, што сітуацыя ва Украіне ўжо некіруемая. Наўрад ці чацвярговае перамір'е будзе плённым. Бо тыя, хто лічаць сябе лідарамі пратэсту, сапраўднымі, нефармальнымі лідарамі не з'яўляюцца. Яцанюк быў супраць дэмантажу помніка Леніну, Клічко спачатку быў супраць гвалту, але іх ніхто не паслухаў. Яны самі аказаліся закладнікамі таго, што выклікалі. Думаю, крызіс не толькі працягнецца, але напярадзе яшчэ будзе яго апагей.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА

УНП 190398583

Минский городской центр недвижимости

УП «Минский городской центр недвижимости»

СООБЩАЕТ О ВНЕСЕНИИ СЛЕДУЮЩИХ ИЗМЕНЕНИЙ В ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ № 01-А-14

(опубликовано в газете «Звязда» от 21.12.2013 г.):

- слова «28 января 2014 г.» заменить словами «5 февраля 2014 г.»;
- слова «22 января 2014 г.» заменить словами «30 января 2014 г.»;
- слова «в 11^{00}» заменить словами «в 16^{00}».

Телефон для справок 226-16-72. Интернет: www.mgcn.by.

ТЕКСТ ОБЪЯВЛЕНИЯ О ВЫКУПЕ АКЦИЙ

Открытое акционерное общество

«Дорожно-строительный трест № 1, г. Витебск»

(ОАО «ДСТ-1, г. Витебск»)

в связи с реорганизацией проводит выкуп собственных акций по требованию акционеров, проголосовавших против, а также не участвовавших во внеочередном общем собрании акционеров 15 января 2014 г. с целью их аннулирования.

Цена выкупа акций Общества составляет:
6 500 (шесть тысяч пятьсот) бел. рублей за одну простую (обыкновенную) акцию.

Письменное требование (заявление) от акционера о выкупе акций направляется по почте либо нарочно в ОАО «ДСТ-1, г. Витебск» по адресу: 210026, г. Витебск, ул. Суворова, 16 (в рабочие дни – с 9.00 до 17.00, тел. (0212) 36 98 50).

Срок предъявления акционерами требований (заявлений) о выкупе акций – с 16 января 2014 г. по 06 марта 2014 г. (включительно).

Для заключения договора купли-продажи акционеру необходимо в срок с 07 марта 2014 г. по 05 апреля 2014 г. обратиться в депозитарий Общества – филиал № 200 – Витебское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк» по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 10-б, кабинет 312, тел. (0212) 20 48 50. При себе иметь паспорт.

Срок оплаты за приобретенные акции – не позднее 10 (десяти) рабочих дней после совершения сделки. Форма оплаты: наличными денежными средствами через кассу Общества или безналичным расчетом на вкладные (карт) счета.

Контактный телефон: (0212) 36 98 50. УНП 300000398

Іван МІХАЙЛАЎ:

«ЖУРНАЛІСТЫКА З ТЫХ ПРАФЕСІЙ, ДЗЕ ПАМІЖ ПРАЦАЙ І ЖЫЦЦЁМ СТАІЦЬ ЗНАК РОЎНАСЦІ»

Ён марыў стаць тэлевядучым з дзяцінства, але пасля школы пайшоў у юрысты. Праўда, жаданне займацца любімай справай перамагло. У 28 гадоў Іван Міхайлаў адважыўся распачаць кар'еру на тэлебачанні. Сёння за плячыма — праца ў праграмах «Спорт-кадр», «Дзелавое жыццё», «Сфера інтарэсаў», «Панарама», а таксама рэпарцёрская дзейнасць. А з нядаўніх пор ён сумяшчае журналістыку з пасадай намесніка дырэктара Агенцтва тэлевізійных навін Белтэлерадыёкампаніі.

— Што змянілася ў вашым жыцці з пераходам на новую пасаду?

— Самае галоўнае — узрасла адказнасць. Раней я адказваў толькі за сваю работу. І так было восем гадоў, за выключэннем нядоўгага па часе прамежку, калі ўзначальваў аддзел палітычных аглядальнікаў. У асноўным жа — сам па сабе. Гэта была больш спакойная пара, таму што цяпер дапамагаю кіраваць калектывам у 270 чалавек. За ўсім трэба назіраць, трымаць на кантролі. Праблем з гэтым ніякіх не ўзнікае, бо ў нас працуе дружны і моцны ў прафесійным плане калектыў. І нам давярае кіраўніцтва Белтэлерадыёкампаніі.

— А як адчуваеце сябе ў ролі кіраўніка?

— У маёй свядомасці ніякіх перамен не адбылося. Безумоўна, з'явіліся новыя абавязкі, якія тычацца гаспадарчых і арганізацыйных пытанняў. Але я стараюся працягваць займацца журналістыкай. Рыхтую рэпартажы, удзельнічаю ў здымках дакументальных праектаў, езджу ў камандзіроўкі. Нядаўна быў вялікі праект «Лёс гігантаў-2», дзе мы ў серыі дакументальных фільмаў распавядалі пра савецкія навагоднія прадукты. Я рабіў фільм пра цэйлонскі чай. Потым асобна яшчэ падрыхтаваў рэпартаж пра Цэйлон.

— «Лёс гігантаў-2» — гэта дакументальныя фільмы з ноткай настальгіі. Як працавалася над праектам?

12.40, 23.55 «Святло далёкай зоркі». Памяці народнага артыста Беларусі Міхаіла Дзянісава.
13.10, 23.30 «Структура вакууму». Навукова-папулярны фільм.
13.35 «Карані».
14.05 «Палескі пачастунак». Куцця.
14.15 «Скарбніца Магілёўшчыны». Мастацтва супраціву.
14.45 М/ф.
15.10 «Белае возера». Маст. фільм.
16.30 «Музеум». Партрэты сям'і Весяловускіх.
16.45 «Пясняр Нарачанскага краю». Жыццё і творчасць народнага паэта Беларусі Максіма Танка.
17.10 «Анёл на мачце». Дак. фільм.
17.40 «Адлюстраванні». Міхал Клеафас Агінскі.
18.05 «Запаведнай сцежкай». Заказнік «Карачэўскі мох».
18.45 «Георг». Маст. фільм.
20.30 Калыханка.
22.00 «У госці да «Камераты». Канцэрт вакальных груп «Камерата» і «The London Quartet».

БЕЛАРУСЬ 5

8.05 Баскетбол. Кубак выкліку. «Цмокі-Мінск» — «Урал» (Расія).
9.40 Гандбол. Чэмпіянат Еўропы. Францыя — Беларусь.
11.05 Біятлон. Кубак свету. Антхольц. Гонка праследавання. Жанчыны.
11.55 Еўрапейскі покерны тур.
12.55—17.00 Тэніс. Кубак Дэвіса. Матч адзіночнага разраду. Беларусь — Ірландыя.
17.00, 21.15—0.25 Тэніс. Турнір ВТА. Парыж.
18.50 Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Гомель» — «Металург» (Жлобін).
0.25 Фактар сілы.

АНТ

6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 «Жыць здорава!».
10.25 «Кантрольная закупка».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 «У наш час».
12.10 «Яны і мы».
13.10 «Добрага здаровейка!».
13.55 «Модны прыгавор».
15.00 «Адваротны адлік». «Беразіно». Пастка для Скарцэні».
15.30 «Вучыцца жыць».
16.25 Маст. фільм «Прыгоды зубнога ўрача».
18.20 «Чакай мяне. Беларусь».
18.55 Поле цудаў.
20.00 Час.
21.05 «Вячэрні Мінск».
22.20 Драма «Чорны лебедзь».
0.20 Камедыя «Місіс Даўтфайр».
2.30 Начныя навіны.

СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
9.00 «Вам і не снілася».
10.05 «Аўтапанарама».
10.40, 17.30 «Званая вячэра».
11.35 «Вовачка». Серыял.
12.05 «Сямейныя драмы».
13.00 «Добры дзень, доктар».
13.50 Трылер «Пункт прызначэння 3».
15.35 «Не хлусі мне!».
16.50 «Следакі».
18.30 «Такі лёс».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 Камедыя «Працэс і памылка».
22.00, 23.00 «На тым жа месцы ў той жа час».
23.40 Кубак Дэвіса. Беларусь — Ірландыя. Відэадзённік.
23.50 «Глядзець усім!».
0.45 «Вялікая гульня». Покердуэль.
1.30 Трылер «Пункт прызначэння 4».

МІР

5.00 «180 хвілін».
8.15 Серыял «Метад Лаўровай».
10.00, 3.25 Маст. фільм «Палёты ў сне і наяве».
11.30 «Сардэчна запрашаем».
12.00, 15.00, 18.00 Навіны Садружнасці (бягучы радок).
12.20 Серыял «Клон».
14.05 Дак. фільм «Рэальны свет».
14.35 «Казахстан заўтра».
15.20 Ток-шоу «Яшчэ не разам».
16.10 Серыял «Ваша чэсць».
18.20 Маст. фільм «Цяжарная бабуля».
21.40 Скетч-шоу «МасГарСмех».
22.40 Маст. фільм «Зайчык».
0.10, 1.50 Кубак Садружнасці-2014. Паўфінал.

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
10.00 «Асаблівы выпадак».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Прамы эфір».
12.40 Серыял «МУР».
13.50, 16.50, 19.50, 23.35 Навіны — Беларусь.
14.20 Дзённік Сочы 2014.
14.30 «Рулетка вялікага тэрору. Чырвоныя—белыя».
15.30 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
16.30 «Мая планета».
17.10 Серыял «Гаспадыня майго лёсу».
18.05 Серыял «Тайны інстытута высакародных дзяўчат».
18.55 Серыял «Белыя ружы надзеі».
20.40 «Смяюцца дазваляецца».
21.40 «Каралі смеху».
23.45 «Жывы гук».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.00 «НТБ раніцай».
8.40, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
11.00 «Да суда».
11.55 «Суд прысяжных».
13.25 «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
14.25 «Справа ўрачоў».
15.15 «Справа густу».
15.40, 18.35 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
16.25 «Пракурорская праверка».
17.35 «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
19.35 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».
23.15 Серыял «Паверх».
1.15 «Авіятары».

8 КАНАЛ

7.00, 12.40, 19.00, 20.55, 0.05 «Надвор'е».
7.05 М/ф.
7.30 Вестэрн «Цудоўная сямёрка».
9.20 «Кінаблакнот».
9.30, 18.00 Серыял «Горад мары».
10.30 «Мой любімы гадаванец».
11.00, 19.05 Серыял «Джо».
12.45 Меладрама «Размаляваная вуаль».
14.50 Серыял «Вяртанне Сандакана».
16.00 Мультпарад.
16.30 «Адшукваецца адпачынак».
17.00 Серыял «Гімнасткі».
20.45 «Вечарніца».
21.00 Фантастыка «Рыдзік».
23.10 Серыял «Спартак. Кроў і пясок».

ВТБ

6.00, 0.30 «PLAY».
8.00 М/ф «Смяшарыкі».
8.30, 18.10, 0.00 Скетч-шоу «6 кадраў».
9.00, 19.00 Серыял «Аманда О».
10.00 «Гардэроб на вылет».
11.00 «Лёс без ахвяр».
12.00, 20.00 Серыял «Думай як жанчына».
13.00, 18.30 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
14.00, 23.30, Скетч-шоу «Даеш моладзь».
15.00 Серыял «Крамлёўскія курсанты».
16.00, 21.10 Серыял «Фізіка або хімія».

КУЛЬТУРА

5.30 «Ёўраньюс».
9.00, 14.00, 18.00, 22.40 Навіны культуры.
9.20 Шэдэўры старога кіно. «Памылка інжынера Кочына». Маст. фільм.
11.20 «Луцый Аней Сенека». Дак. фільм.
11.30 «Правілы жыцця». Ток-шоу.
11.55 «Пісьмы з правінцыі».
12.25 «Справа Артамонавых». Маст. фільм.
14.10 Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
14.50 «Кантрасты і рытмы Аляксандра Дэйнекі». Дак. фільм.
15.30, 1.40 «Сусветныя скарбы культуры».
15.45 «Царская ложа». Галерэя музыкі.
16.30 Гульні класікаў. Леў Уласенка.
17.30 Смеханастальгія.
18.15, 0.55 «Шукальнікі». «Калекцыя Калбасьева».
19.00 Калекцыя Францыза Саган. «Прывітанне, сум». Маст. фільм.
20.35 75 гадоў з дня нараджэння Аляксандра Парахаўшчыкова. Дак. фільм.
21.15 Дзіцячы хор Расіі, Валерый Гергіеў і сімфанічны аркестр Марыінскага тэатра. Канцэрт у Марыінскім-2.
23.00 «Культ кіно». «Дрэва жадання». Маст. фільм.

НАСТАЛЬГІЯ

5.00 «Клуб кінападарожнікаў». «Невядомы Кусто». 1985 год.
6.05 «Вячэрнія мелодыі». Фільм-канцэрт . 1985 год.
6.30, 12.30, 18.30, 0.30 «Амерыканская трагедыя». Маст. фільм.
8.00, 14.00, 20.00, 2.00 «Мінулы час».
9.00, 3.00 «Народжаныя ў СССР».
10.00, 16.00 «Аншлаг? Аншлаг!» 1990 год.
11.00 «Майстры мастацтваў». «Яўген Лявонаў». Памяці артыста. 1986 год.
12.10 «Аркестр Поля Марыа». Фільм-канцэрт. 1983 год.
17.00 «Яловая субмарына» . «Гісторыя рускага рока».
18.05 «Вакол ды каля». Гумарыстычная перадача. 1994 год.
18.40 «Ананімка». Па аднаймённай п'есе С. Міхалкова. 1987 год.
21.00 «Колба часу».
22.00 «Кінапанарама». «Майстры савецкага кіно». 1982 год. 1-я частка.
23.00 «Слям, сябры!».
0.10 «Бамонд». 1992 год.
1.40 «Спакойнай ночы, малыя», «Прыгоды Лёліка і Боліка».
4.00 «Свежы вецер». Фільм-канцэрт. 1991 год.

EUROSPORT

10.30, 14.00 Лёгкая атлетыка. Турнір у закрытым памяшканні.
11.30, 15.00, 22.00 Снукер. Германія Мастэрс.
12.30, 19.30, 1.00 Футзала. Чэмпіянат Еўропы.
18.15, 2.15 Скачкі на лыжах. Кубак свету.
2.00 GTA. Наступны ўзровень.
3.15 Вось гэта дзіва!!!

КАМЕДЫЯ

5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05 Скетчком «Паміж намі».
5.15, 8.00, 12.55, 16.00, 2.20 Серыял «Пасля твайго адыходу».
6.15 Камедыя «Адна жанчына або дзве».
9.00 Камедыя «Забойствы — мой канёк, дарагая».
11.15 Камедыя «Хто такі Гары Крамб?».
14.10 Камедыя «Плюшавы сіндром».
17.20 Камедыя «Містар Піткін: Ранняя пташка».
19.20 Камедыя «Брат і сястра».
21.00 Серыял «Няўдачнік». 1-я серыя.
22.10 Камедыя «Жаніх напракат».
0.10 Камедыя «Загадана ажаніць».
1.50 «Камедыянты. Лепшае».
3.25 Камедыя «Каханне на востраве».

ТБ3

6.00 М/ф.
8.30, 14.45 «Доктар І...».
9.00, 18.30, 4.35 «Забароненае каханне». Серыял.
10.30, 17.00 «Паралельны свет». Дак. серыял.
11.30, 16.00 «Варажбітка». Дак. серыял.
12.30, 18.00 «Паляўнічыя на прывідаў». Дак. серыял.
13.00 «Агент». Серыял.
13.50 «Дом дагары нагамі».
15.15, 1.15 «Звышнатуральнае». Серыял.
20.15 «Таўстун на рынгу». Маст. фільм.
22.15 «Ты не ведаеш Джэка». Маст. фільм.
0.30 «Падмані мяне». Серыял.

ТБ1000

5.00 Камедыя «Людзі ў чорным».
6.55 Дэтэктыў «Дванаццаць сяброў Оўшэна».
9.15 Баявік «Легенда Зора».
11.35 Трагікамедыя «Вундэркінды».
13.30 Камедыя «Трынаццаць сяброў Оўшэна».
15.40 Драма «Успаміны няўдачніка».
17.35 Трагікамедыя «Жыццё цудоўнае».
19.20 Камедыя «Ходзяць чуткі...».
21.10 Мюзікл «У рытме сэрца».
23.00 Трагікамедыя «Рок-зорка».
1.00 Камедыя «Рэальнасць кусаецца».
3.00 Трылер «Ракавое чысло 23».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.00 Драма «Адзіная».
7.45 Драма «Мелодыя для катрынкі».
10.30 Камедыя «Ржэўскі супраць Напалеона».
12.00 Трагікамедыя «Тэатр».
14.30 Камедыя «Са мною вось што адбываецца».
16.00 Драма «Поп»
18.20 Камедыя «Наша Russia. Яйкі Лёсу».
20.00 Камедыя «Кантракт на каханне».
21.45 Драма «Цуд».
0.00 Меладрама «Трывалы шлюб».
1.50 Меладрама «Мама паняволі».
4.00 Баявік «Ільвіная доля».

NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00 National Geographic: 125 дзіўных фота.
6.00, 15.00 Самыя небяспечныя жывёлы.
7.00 Загадкі каралеўскай кобры.
8.00, 12.00 Аферысты і турысты.
10.00, 17.00 Мегазаводы.
11.00 Боскае ўмяшанне.
14.00 Ноч ільва.
16.00, 2.00 Патанулая субмарына фашыстаў.
18.00 Золата Юкана.
19.00 Выкраданне месяцовага каменя.
20.00, 0.00, 3.00 Камень за 400 млн доларaў.
21.00, 1.00, 4.00 Грашовае сховішча ЗША.
22.00 Вайна за золата Калумбіі.
23.00 Тайны вакол нас.

DISCOVERY

7.00 У пагоні за класікай.
7.50, 13.15 Хлопцы з Юкана.
8.40, 20.35 Як гэта ўстроена?
9.10, 20.05, 4.45 Як гэта зроблена?
9.35 Брудныя грошы.
10.30, 0.55 Top Gear.
11.25 Як уладкаваны Сусвет.
12.20, 1.50 Сапраўдныя аферысты.
14.10, 3.55 Аўтамабільныя таргі ў Тэхасе.
15.05, 6.05 Махінатары.
16.00 Пятая перадача. Еўропа.
16.25 Эд Стафард: голае выжыванне.
17.20, 3.05 Скарбашукальнікі Амерыкі.
18.15 Золата джунгляў.
19.10 Залатая ліханаманка.
21.00 Сістэмы кіравання.
22.00 Цуды Сонечнай сістэмы.
23.00 Пераломны момант.
0.00, 5.10 Навука магіі.
2.40 Маланкавыя катастрофы.

СУБОТА, 1 ЛЮТАГА

БЕЛАРУСЬ 1

7.10 Існасць.
7.40 Камедыя «Сем нянек».
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 Зямельнае пытанне.
9.35, 23.45 Серыял «Саша-Таня».
11.30 Тайны следства.
12.10 Клуб рэдактараў.
12.55 Здароўе.
13.40 Журналісцкае расследаванне.
14.15 Вакол планеты.
15.15 Навіны рэгіёна.
15.30 «Без права на дубль». Аляксандр Кайданоўскі.
16.35 Давярай і правярай.
17.10 Нашы.
17.20 Анімацыйны фільм «Сезон палявання».
18.55 Меладрама «Пад прыцэлам кахання».
21.00 Панарама.
21.40 Камедыя «Вялікі куш».
23.35 Дзень спорту.

БЕЛАРУСЬ 2

7.35 Фільм-казка «Марозка».
8.55 М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
10.10, 21.10 Тэлебарометр.
10.15 Беларуская кухня.
10.50 Драма «Другі шанц».
13.10 «Бітва экстрасэнсаў».
14.20 Вышэй чым дах.
14.50 Камедыя «Высокашаноўны джэнтльмен».
17.05, 1.30 Серыял «Таксі».
18.05 Імперыя песні.
19.10 Ваша лато.
19.55 Латарэя «Пяцёрачка».
20.05 «Суперінтуіцыя. Каханне».
21.05 «КЕНО».
21.15 Маст. фільм «Тыгр, які крадзецца, дракон, які затаіўся».
23.25 Тэніс. Парыж. Жанчыны. Паўфінал.

БЕЛАРУСЬ 3

8.00, 11.40, 15.20, 17.00, 19.20, 0.25 «Калейдаскоп».
8.10 «Прыстанак душы».
8.35 «Сакрэт фірмы».
8.55 Дзіцячы фільм. «Канікулы Пятрова і Васечкіна, звычайныя і неверагодныя». 1-я і 2-я серыі.
11.10 «Наперад у мінулае».
11.45 «Тысячагадовае Заслаўе». Дак. фільм.
12.20 «Камертон». Райманд Паўлс.
12.45 «Крылатая вясёлка». Навукова-папулярны фільм.
13.00 «Цябе кахаю, табе і веру...». Памяці Сяргея Ясеніна.
13.30 «Карані».
14.00 «Прыміце тэлеграму ў доўг». Маст. фільм.
15.25 Канцэрт «У госці да «Камераты». Канцэрт вакальных груп «Камерата» і «The London Quartet».
17.10 «Трэст, які лопнуў». Маст. фільм. 1-я — 3-я серыі.
20.30 Калыханка.
20.50 Сусветнае кіно. «Эпоха нявіннасці».
23.05 «Эпоха». Паэт, публіцыст, дзеяч нацыянальна-вызваленчага руху Адам Міцкевіч.
23.55 «АРТіШОК».

БЕЛАРУСЬ 5

8.05, 16.55 Фактар сілы.
8.30 Тэніс. Турнір ВТА. Парыж.
10.15 Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Гомель» — «Металург» (Жлобін).
12.05 Гандбол. Чэмпіянат Еўропы. Расія — Беларусь.
13.30 Біятлон. Кубак свету. Антхольц. Спрынт. Жанчыны.
14.55 Тэніс. Кубак Дэвіса. Матч парнага разраду. Беларусь — Ірландыя.
16.55 Фактар сілы.
17.25—20.55 Тэніс. Турнір ВТА. Парыж. Паўфінал.
20.55 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Эвертан» — «Астан Віла».
22.45 Еўрапейскі покерны тур.
23.35 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Вест Хэм» — «Суонсі».

АНТ

7.00 «Суботняя раніца».
8.00, 9.00, 16.00, 20.30 Нашы навіны.
9.05 М/с «Смяшарыкі». Новыя прыгоды.
9.20 «Здароўе».
10.20 «Смак».
11.00 «Ідэальны рамонт».
11.55 «Разумніцы і разумнікі».
12.40 Маст. фільм «Паездкі на старым аўтамабілі».
14.10 «Хвіліна славы. Дарога на Алімп». Фінал.
16.15, 21.00 Навіны спорту.
16.20 «Бацькоў у школу!».
17.35 «Адзін супраць усіх».
18.15 «Я спяваю!».
21.05 «Сёння вечарам».
22.45 Да 70-годдзя школы-студыі МХАТ. Юбілейны вечар.
0.35 Маст. фільм «Ваенна-палявы шпіталь».

СТБ

6.20 «Чатыры танкісты і сабака». Серыял.
8.20 «Далёкія сваякі».
8.45 Камедыя «Працэс і памылка».
10.30 «Сакрэтныя тэрыторыі».
11.30 «Мінск і мінчане».
12.05 «Прыгоды дылетанта».
12.40 Меладрама «Закаханы па ўласным жаданні».
14.20 «Ваенная тайна».
16.30, 19.30 «24 гадзіны».
16.45 «Наша справа».
17.00 «Вялікі горад».
17.40 «Дзіўная справа».
18.30 «Разумней не прыдумаеш».
20.00 «СТБ-спорт».
20.10 Маст. фільм «Чарлі і шакаладная фабрыка».
22.20 «Зорны рынг. Новы сезон. Бітва кавер-бэндаў». «Марыда» супраць «The Feedback».
23.35 Кубак Дэвіса. Беларусь — Ірландыя. Відэадзённік.
23.45 Маст. фільм «Я ведаю, што ты ведаеш».
1.10 «Вялікія тайны акіяна».

МІР

5.00 М/ф.
7.50 «Мільён пытанняў пра прыроду».
8.15 «Эксперыментатары».
8.30 «Мар! Дзейнічай! Будзь!».
9.00, 15.00 Навіны Садружнасці (бягучы радок).
9.10 «Любімыя акцёры».
9.35 Маст. фільм «Зайчык».
11.05 Маст. фільм «Цяжарная бабуля».
14.25, 23.30 Скетч-шоу «МасГарСмех».
15.10, 0.25 Серыял «Амазонкі».
19.35 «Навіны Садружнасці (бягучы радок). Культура».
20.15 Маст. фільм «Ёўропа — Азія».
21.45 Маст. фільм «Інспектар-разявака».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 Маст. фільм «Ніколі не размаўляйце з незнаёмцамі».
8.30 Маст. фільм «Здзіві мяне».
10.20 «Ранішняя пошта».
11.00, 14.00 Весткі.
11.10 «Суботнік».
11.50 «Планета сабак».
12.25 «Пакой смеху».
12.35 Маст. фільм «Мой пяшчотна каханы дэтэктыў».
14.15 «Сумленны дэтэктыў».
14.50 «Калі танец становіцца жыццём». Кацярына Максімава.
15.45 «Гарадок».
16.50 «Суботні вечар».
19.00 «Карціна свету».
19.55 Надвор'е на тыдзень.
20.00 Весткі ў суботу.
20.45 Маст. фільм «Дачакацца кахання».
0.10 «Пакой смеху».
0.30 Дыяна Арбеніна і «Начныя снайперы». «ХХ гадоў на сцэне».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.30 Серыял «Агент асобага прызначэння».
8.00, 10.00, 13.00, 16.00 Сёння.
8.20 «Агляд».
8.50 «Іх норавы».
9.25 «Справа густу».
10.20 «Галоўная дарога».
10.50 «Кулінарны паядынак».
11.55 «Кватэрнае пытанне».
13.20 Дэтэктыў «Іржа».
15.05 «ДНК». Ток-шоу.
16.15 «Выратавальнікі».
16.45 «Следства вялі...».
17.35 «Вочная стаўка».
18.30 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
19.00 «Цэнтральнае тэлебачанне».
19.55 «Новыя рускія сенсацыі».
20.55 «Ты не паверыш!».
22.00 Баявік «Зімовы круіз».
23.45 Маст. фільм «Знайдзі мяне».

8 КАНАЛ

9.00, 14.45, 18.20, 20.55, 23.50 «Надвор'е».
9.05 «Мультпарад».
10.25 Серыял «Джо».
12.05 «Даведнік па краінах і кантынентах».
12.15 Фантастыка «Рыдзік».
14.50 Серыял «Вяртанне Сандакана», заключная серыя.
16.00 «Адшукваецца адпачынак».
16.30 Фільм — дзецям. «Сабрына — маленькая ведзьма».
17.15 Серыял «Лэдзі-дэтэктыў».
18.25 Драма «Не ўзяў за руку — не кажы: злодзей».
20.45 «Вечарніца».
21.00 «Неверагодная магія».
21.10 Меладрама «Мінулай ноччу ў Нью-Ёрку».
22.55 Серыял «Спартак. Кроў і пясок».

ВТБ

6.00, 0.30 «PLAY».
8.30 М/ф «Смяшарыкі».
9.00 Серыял «Татавы дочкі».
10.00, 15.00 Скетч-шоу «Асцярожна, дзеці!».
10.30, 16.00, 0.00 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
11.00, 22.45 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
11.30, 16.30, 23.30 Скетч-шоу «6 кадраў».
12.00 «Яда па правілах і без».
13.00 «Добрыя жарты».
17.30 «Уральскія пельмені».
19.00 Серыял «Апошні з Магікян».
20.30 Фэнтэзі «Забароненае царства».

КУЛЬТУРА

5.30 «Ёўраньюс».
9.00 Біблейскі сюжэт.
9.35 «Валерый Чкалаў». Маст. фільм.
11.10 «Уладзімір Белакураў. Эпікурэец з МХАТа». Дак. фільм.
11.55 «Расія, любоў мая!».
12.20 «У порце». «Катарок». «Птушачка Тары». М/ф.
12.55 «Пешшу...». Масква дзіцячая.
13.25 «Што рабіць?».
14.10 Да 75-годдзя з дня нараджэння Кацярыны Максімавай. «Больш, чым каханне».
14.50 Фільм-балет «Галатэя».
15.50 «Хто там...».
16.20 «Першы манастыр Масквы. Наваспаскі манастыр». Дак. фільм.
17.00 «Кантэкст».
17.40, 0.55 «Шукальнікі». «Вострай-прывід».
18.25 «Пётр Першы». Дак. фільм.
18.35 «За сталом сямі мараў». Спявае Алег Пагудзін.
20.00 «Жыццё і лёс». Маст. фільм. Фільм 2-і.
21.15 «80 гадоў Атару Іаселіяні. «Мой сябар Атар Іаселіяні». Дак. фільм.
22.05 «Жыў пеўчы дрозд». Маст. фільм.
23.25 Эл Джаро і Ларыса Долініна. Канцэрт у Маскве.
0.35 «Вяртанне з Алімпа». М/ф для дарослых.
1.40 «Сусветныя скарбы культуры».

НАСТАЛЬГІЯ

5.00 «Майстры мастацтваў». «Яўген Лявонаў». Памяці артыста. 1986 год.
6.10 «Аркестр Поля Марыа». Фільм-канцэрт. 1983 год.
8.30 М/ф «Смяшарыкі».
9.00 Серыял «Татавы дочкі».
10.00, 15.00 Скетч-шоу «Асцярожна, дзеці!».
10.30, 16.30, 23.30 Скетч-шоу «6 кадраў».
11.00, 22.45 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
11.30, 18.30, 0.30 «Амерыканская трагедыя». Маст. фільм.
12.00 «Яда па правілах і без».
13.00 «Добрыя жарты».
17.30 «Уральскія пельмені».
19.00 Серыял «Апошні з Магікян».
20.30 Фэнтэзі «Забароненае царства».

КУЛЬТУРА

5.30 «Ёўраньюс».
9.00 «Звычайны канцэрт».
9.35 «Валерый Чкалаў». Маст. фільм.
11.10 «Уладзімір Белакураў. Эпікурэец з МХАТа». Дак. фільм.
11.55 «Расія, любоў мая!».
12.20 «У порце». «Катарок». «Птушачка Тары». М/ф.
12.55 «Пешшу...». Масква дзіцячая.
13.25 «Што рабіць?».
14.10 Да 75-годдзя з дня нараджэння Кацярыны Максімавай. «Больш, чым каханне».
14.50 Фільм-балет «Галатэя».
15.50 «Хто там...».
16.20 «Першы манастыр Масквы. Наваспаскі манастыр». Дак. фільм.
17.00 «Кантэкст».
17.40, 0.55 «Шукальнікі». «Вострай-прывід».
18.25 «Пётр Першы». Дак. фільм.
18.35 «За сталом сямі мараў». Спявае Алег Пагудзін.
20.00 «Жыццё і лёс». Маст. фільм. Фільм 2-і.
21.15 «80 гадоў Атару Іаселіяні. «Мой сябар Атар Іаселіяні». Дак. фільм.
22.05 «Жыў пеўчы дрозд». Маст. фільм.
23.25 Эл Джаро і Ларыса Долініна. Канцэрт у Маскве.
0.35 «Вяртанне з Алімпа». М/ф для дарослых.
1.40 «Сусветныя скарбы культуры».

НАСТАЛЬГІЯ

5.00 «Яловая субмарына» . «Гісторыя рускага рока».
6.05 «Вакол ды каля». Гумарыстычная перадача. 1994 год.
6.40 «Ананімка». Па аднаймённай п'есе С. Міхалкова. 1987 год.
8.00, 2.00 «Мінулы час».
9.00 «Колба часу».
10.00 «Кінапанарама». «Майстры савецкага кіно». 1982 год. 1-я частка.
11.00 The Best of "СевАлогія».
12.20 "Горад і песня». Фільм-канцэрт. 1968 год.
13.30 «У суботу вечарам». 1991 год.
15.00 «Двайныя непрыемнасці». Маст. фільм.
16.30 «Пакуль усе дома». 1993 год.
17.00 «Поле цудаў». 1993 год.
18.00, 3.00 «Народжаныя ў СССР».
19.00 «Вясёлая моладзь». 1983 год.
20.00 «Галіна Вішнеўская ў «Астанкіне». Фільм-канцэрт. 1993 год.
21.00 «Тэатральныя сустрэчы». 1966 год.
23.00 «Майстры мастацтваў». «Яўген Лявонаў». Памяці артыста. 1986 год.
0.10 «Аркестр Поля Марыа». Фільм-канцэрт. 1983 год.
19.45, 1.00 Футзала. Чэмпіянат Еўропы.
22.00 Снукер. Германія Мастэрс.
2.00 Ралі. ERC.

КАМЕДЫЯ

5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05 Скетчком «Паміж намі».
5.15, 12.55, 21.00 Камедыя «Пародыя на Кармэн».
6.00, 13.50, 21.50 Камедыя «Сапернікі-донжуаны, або Жгэтыя пакуты кахання».
6.15 Камедыя «Хто такі Гары Крамб?».
7.45 «Камедыянты. Лепшае».
8.00, 16.00, 2.20 Камедыя «Яго новая праца».
8.35, 16.35, 2.55 Камедыя «Вечар у тэатры».
9.00 Камедыя «Плюшавы сіндром».
11.15 Камедыя «Містар Піткін: Ранняя пташка».
14.10 Камедыя «Жаніх напракат».
17.20 Камедыя «Брат і сястра».
19.20 Камедыя «Зачараваная Эла».
22.10 Камедыя «Як страціць сяброў і прымусіць усіх цябе ненавідзець».
0.10 Камедыя «Забойствы — мой канёк, дарагая».
3.25 Камедыя «Адна жанчына або дзве».

ТБ3

6.00 М/ф.
9.40, 4.50 «Сябры». Серыял.
10.55 «Сардэчна запрашаем дамоў!».
11.45, 0.45 «Тайны нашага кіно. «Жорсткі раманс».
12.15, 1.15 «Жорсткі раманс». Маст. фільм.
15.00 «Алёша Паповіч і Тугарын Змей». М/ф.
16.15, 3.30 «Валасы. Заблытаная гісторыя». Дак. фільм.
17.45 «Дары валхвоў». Спецыяльны рэпартаж.
18.15 «Астэрыкс і Абелікс супраць Цэзара». Маст. фільм.
20.15 «Таўстун на рынгу». Маст. фільм.
22.15 «Ты не ведаеш Джэка». Маст. фільм.
0.30 «Падмані мяне». Серыял.

ТБ1000

5.00, 13.00 Тайна марскога д'ябла.
6.00 Рыбы-пачвары.
7.00 Паляўнічы на прэснаводных гігантаў.
8.00 Злавіць сома.
9.00 Золата Юкана.
10.00 Золата горада-прывіда.
11.00 Супербудаванні Трэцяга рэйха.
12.00 Паветраныя асы вайны.
14.00 Напад каётаў.
15.00 Дзікая прырода Амерыкі.
16.00 Выкраданне месяцовага каменя.
17.00 Камень за 400 млн доларaў.
18.00 Грашовае сховішча ЗША.
19.00 Вайна за золата Калумбіі.
20.00, 0.00, 3.00 Расследаванні авіякатастроф.
21.00, 1.00, 4.00 Жах у нябёсах.
22.00 Крылаты экстрэмал.
23.00, 2.00 Забароны ЗША.

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.00 Казка «Чароўная лямпа Аладзіна».
8.00 Меладрама «Аднакласнікі».
10.00 М/ф «Дабрыня Мікітавіч і Змей Гарыныч».
12.00 Казка «Варвара краса — доўгая каса».
14.00 Камедыя «Кантракт на каханне».
16.00 Камедыя «Прывітанне, мы ваш дах!».
18.00 Меладрама «Хатняя работніца».
20.00 Трагікамедыя «Аддаць канцы».
22.00 Драма «Жыць».
0.10 Камедыя «Навагодні шлюб».
2.00 Драма «Збавенне».
4.10 Меладрама «Кветкі ад Лізы».

NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00, 13.00 Тайна марскога д'ябла.
6.00 Рыбы-пачвары.
7.00 Паляўнічы на прэснаводных гігантаў.
8.20 Злавіць сома.
9.00 Золата Юкана.
10.00 Золата горада-прывіда.
11.00 Супербудаванні Трэцяга рэйха.
12.00 Паветраныя асы вайны.
13.00 Напад каётаў.
14.00 Прыручыць дракона.
15.00 Дзікая прырода Амерыкі.
16.00 Старацелі.
17.00 Камень за 400 млн доларaў.
18.00 Грашовае сховішча ЗША.
19.00 Вайна за золата Калумбіі.
20.00, 0.00, 3.00 Расследаванні авіякатастроф.
21.00, 1.00, 4.00 Жах у нябёсах.
22.00 Крылаты экстрэмал.
23.00, 2.00 Забароны ЗША.

DISCOVERY

7.00 Як гэта ўстроена?
7.25, 13.40 Хуткія і гучныя.
8.15, 19.10 Адзін дзень з жыцця Беара Грылса.
9.10, 2.40 Хлопцы з

■ І сабе, і людзям

Як надаць новае жыццё старым рэчам

З праблемай перапоўненасці шаф, антрэсоляў і паліц перыядычна сутыкаецца кожны. І тады пачынаюцца рэвізіі адзення, кніг, цацак… Калі хатнія «завалы» нарэшце разабраны, паўстае пытанне, куды падзець «дабро», якое доўгія гады назапашвалася і займала месца ва ўсіх кутах кватэры. Адвезці на лецішча, занасіць да дзірак і пусціць на анучы? Сабраць у пакунак і выставіць каля кантэйнера для смецця? Раздаць знаёмым, здаць у камісійную краму ці ў дабрачынны фонд? Карэспандэнт «Звязды» высвятляла, куды можна прыстроіць ужо не новыя, але яшчэ прыстойныя рэчы, і наколькі лёгка гэта зрабіць.

Варыянт з лецішчам для многіх самы бяспройгрышны, праўда, толькі ў тым выпадку, калі гэтае лецішча ёсць. Калі рэчаў зусім не шкада, можна паставіць пакунак з імі побач са сметнікам — звычайна ўжо праз пяць хвілін такога «дабрачыннага акту» торба чароўным вобразам знікае. Суседзям і знаёмым таксама можна аддаць не ўсё: наўрад ці сяброўка стане даношваць вашу сукенку дзесяцігадовай даўніны. Ды і вы самі хіба зможаце спакойна глядзець на калісьці любімую рэч, якая цяпер належыць не вам?

Адзін з самых распаўсюджаных варыянтаў прымянення ўжо непатрэбных рэчаў — дабрачыннасць. Але перад тым, як ажыццяўляць прынцып «панасіў — дай другому панасіць», неабходна прывесці тое ж адзенне да «таварнага» выгляду, бо, як правіла, ва ўсіх дабрачынных арганізацыях патрабаванні да стану сэкандчым, дзіцячым адзенні і абутку. Прымаюць у Чырвоным Крыжы таксама прадметы гігіены. Прывезці ахвяраванні можна як у мінскую гарадскую арганізацыю (па адрасе: В. Харужай, 18, к. 1), так і ў абласныя арганізацыі.

Як правіла, прымаюць рэчы ва ўсіх цэрквах, касцёлах і манастырах, але лепш удакладняць, што менавіта там патрэбна. Некалькі гадоў таму карэспандэнт «Звязды» паспрабавала аддаць абсалютна новы, але ўжо не вельмі модны жаночы абутак у Дом міласэрнасці. І там спачатку паглядзелі на яго з сумневам, а пасля ўказалі іншы адрас, па якім можна яго адвезці, і сказалі, што «там, магчыма, прымуць». Чым ездзіць па ўсім горадзе, не ведаючы, ці дасць гэта плён, я вырашыла тады проста аддаць абутак бабулі ў вёску — там дакладна каму-небудзь ды спатрэбіцца. Тым не менш, адкрыта

Перад тым, як ажыццяўляць прынцып «панасіў — дай другому панасіць», неабходна прывесці тое ж адзенне да «таварнага» выгляду.

заяўляюць пра сваю патрэбу ў дабротных патрыманых рэчах Свята-Елісавецінскі манастыр (г. Мінск, вул. Выгоцкага, 2, тэл.8 017 289 89 19), Касцёл святых Сымона і Алены на сталічнай плошчы Незалежнасці (тэл. 8 017 200 44 15), храм у гонар мінскай іконы Божай Маці (вул. Галадзеда, 60, тэл. 8 017 341 82 06). У пералічаных храмах прымаюць любы абутак, жаночае, мужчынскае, дзіцячае адзенне. Прыносіць рэчы лепш за ўсё ў суботу ці нядзелю, а можна загадзя ўзгадніць час на іншы дзень па тэлефоне.

Ахвяраванняў чакаюць не толькі храмы, але і дабрачынныя фонды і асацыяцыі, якіх сёння вялікае мноства. Гэта і дабрачынны фонд «Дотык да жыцця» (г. Мінск, вул. Някрасава, 35, к.1, офіс 3, тэл. 8 017 292 48 07), і Беларуская асацыяцыя дапамогі дзецям-інвалідам (вул. Д. Сердзіча, 9, уваход з боку двара;, тэл. 8 017 256 73 90), «Беларускі фонд міласэрнасці і здароўя» (вул. К. Маркса, 39, тэл. 8 017 327 28 80), Беларускае таварыства «Чарнобыльскі бусел» (толькі дзіцячыя рэчы; пр. Незалежнасці, 78, тэл. 8 017 280 29 14), Цэнтр падтрымкі сям'і і мацярынства «Матуля» (МТС: 2 701 701, Velcom: 5 701 701) і іншыя.

А яшчэ рэчы, што былі ва ўжытку, прымаюць у тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, якія ёсць у кожным раёне сталіцы.

Можна звярнуцца ў камісійныя крамы. Яны яшчэ даволі паспяхова функцыянуюць у нашай краіне, прычым нават маюць падзел: ёсць «камісіёнкі» для адзення невядомых вытворцаў, а ёсць — брэндавыя.

Апроч перадачы ў пералічаныя месцы, існуюць яшчэ спосабы пазбавіцца ад непатрэбных рэчаў у добрым стане. Напрыклад, можна звярнуцца ў камісійныя крамы. Яны яшчэ даволі паспяхова функцыянуюць у нашай краіне, прычым нават маюць падзел: ёсць «камісіёнкі» для адзення невядомых вытворцаў, а ёсць — брэндавыя. Станоўчы момант такога вырашэння праблемы непатрэбных рэчаў у тым, што пасля іх рэалізацыі вам заплацяць пэўную суму грошай. Вядома, не поўны кошт, а нейкі працэнт ад яго. Зрэшты, гэта лепей, чым проста выкінуць рэчы, якія даўно надакучылі.

Можна таксама здаць рэчы ў першую і пакуль адзіную ў Беларусі дабрачынную краму «KaliLaska» (пр. Незалежнасці, 58, к. 6, паверх 2, 8 029 606 11 04). Тут, апроч адзення і абутку, прымаюць яшчэ і кнігі, фотаапараты і вінілавыя пласцінкі, корм для хатніх гадаванцаў, упрыгажэнні і прадметы інтэр'еру. Усе рэчы прымаюць чыстымі, спраўнымі, у добрым стане.

А яшчэ ў сеціве існуе сайт otdamdarom.by, дзе можна размясціць сваю прапанову аб тым, ад чаго вы хочаце пазбавіцца. Тут ёсць розныя катэгорыі: для дома, для сябе, камп'ютары і тэхніка, кнігі, дыскі, касеты, аўта-мота, жывёлы і расліны, хобі і іншае, што не паддаецца класіфікацыі.

Такім чынам, дапамагчы людзям, нават проста вызваляючы свой дом ад «залежаў», не так ужо і складана.

Дзіяна СЕРАДЗЮК

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА

фота слова

Як самы лепшы
навагодні падарунак —
Дзень па хвілінцы прырастае,
пакрысе.
Святлей становіцца
ад нашых светлых думак,
Шкада, у гэта вераць не усе.

Ад шэрых думак
край хаваецца у цені,
Ад чорных думак
шлях губляецца ўначы.
Дзень прырастае незаўважна,
па імгненні,
А колькі іх у вечнасці — злічы!

Усё раней ўстае над краем сонца,
І светлых мар людскіх
нікому не злічыць...
Дзень прыбаўляецца упэўнена,
бясконца,
Каб цемру назаўжды перамагчы.

■ Турыстычная глыбінка

ДОБРА І ЗІМОЮ

Колькасць аграсядзіб у нас расце з кожным годам. Паводле звестак Міністэрства па падатках і зборах, калі яшчэ ў 2006 годзе ў краіне налічваліся ўсяго 34 суб'екты аграэкатурызму, то ў 2012-м — ужо каля 1800. А колькасць наведвальнікаў павялічылася ажно ў 15 разоў. На адной толькі Мядзельшчыне, напрыклад, пачынаючы з 2007 года, створана 69 аграсядзіб, якія за мінулы год наведалі 2606 чалавек.

Нягледзячы на даволі высокія цэны, аграсядзібы карыстаюцца папулярнасцю як сярод беларусаў, так і сярод гасцей з замежжа. Улетку гараджане едуць сюды, каб адпачыць ад гарадской мітусні, пагуляць па лесе, пазбіраць грыбы або ягады, парыбачыць ці папарыцца ў лазні.

— Я звычайна прапаную сваім гасцям экскурсію па Нарачанскім краі! Так шмат можна расказаць пра гісторыю гэтых маляўнічых месцаў! А яшчэ падчас экскурсій я шмат распавядаю пра расліны, што растуць у нашых лясах, паказваю розныя гаючыя травы, тлумачу, ад якіх хвароб яны дапамагаюць і як іх правільна нарыхтоўваць, — расказвае гаспадыня аграсядзібы «Крынічка» Станіслава Астраўская. — У садзе каля дома ажно 40 шпакоўняў! Мае госці могуць тут, апроч адпачынку, атрымаць і асалоду ад птушынага спеву.

Але гэта ўсё выдатна для цёплага сезона. А што могуць прапанаваць турыстам гаспадары сядзіб цяпер, калі па лесе хадзіць ужо холадна, грыбы зніклі, рыба не клюе, ды і ўвогуле на вуліцу лішні раз выходзіць не хочацца? Чым яны могуць завабіць турыстаў, каб яны паехалі менавіта сюды, а не ў паўднёвыя краіны, дзе сонца круглы год?

А вось тут — пытанні. На жаль, у большасці сядзіб выбар забаў даволі стандартны: стол, лазня, музычныя караоке, барбекю ды экскурсіі да бліжэйшых славутасцяў. Яшчэ гасцям прапаноўваюцца ў арэнду мангал, лодка і спартыўны інвентар. У «даражэйшых» сядзібах можна сустрэць більярд, стол для настольнага тэніса, а то і невялічкі крыты басейн. Разумеючы абмежаванасць такога асартыменту для пабачыўшага свет турыста, уладальнікі некаторых сядзіб прапануюць гасцям больш незвычайныя забавы, часам нават экстрэмальныя. Напрыклад, гаспадары аграсядзібы «Тры Скрыпкі» на Мядзельшчыне даюць адчуць, як жылі іх продкі ў беларускай вёсцы стагоддзе таму. Унутранае ўбранне гасцявога дома нагадвае жыллё сялян пачатку мінулага стагоддзя. Адначасова гаспадары праводзяць розныя майстар-класы, на якіх вучаць пляценню лапцей, вязанню венікаў для лазні, нарыхтоўцы сена на зіму або выпяканню хлеба, а таксама могуць разам з госцем прыгатаваць традыцыйныя беларускія стравы. Цікава? Безумоўна.

Фота Анатоля КІШЧУКА.

А гаспадары кавальскай сядзібы «Трабуцішкі», якая знаходзіцца ў Пастаўскім раёне, запрашаюць сваіх гасцей паўдзельнічаць у кавальскім майстар-класе, пакатацца на коннай брычцы ці санях, атрымаць асалоду ад жывой народнай музыкі. Аматарам спартанскага адпачынку гаспадары прапануюць самім зладзіць намётавы лагер. Яны прадастаўляюць і палаткі для начлегу са спальнымі мяшкамі і нават палатку для сталовай.

Сядзібна-паркавы комплекс «Панскі маёнтак Сула», што ў Стаўбцоўскім раёне, прыцягвае наведвальнікаў экстрэмальнымі забавамі. Сваім гасцям гаспадары сядзібы прапануюць… верталётныя прагулкі, падчас якіх з вышыні птушынага палёту можна паглядзець на навакольныя лясы і палі, на знакамітыя беларускія помнікі архітэктуры — Мірскі і Нясвіжскі замкі. Але не толькі на сваю ўласную авіяцыю багатая «Сула». Тым, хто не любіць лятаць, прапануюцца конныя прагулкі, а таксама заняткі з інструктарам па верхавой яздзе. І аднадзённыя ці шматдзённыя конныя паходы, падчас якіх госць можа акунуцца ў атмасферу мінулых стагоддзяў і на колькі часу адчуць сябе рыцарам або мушкецёрам.

Аграсядзіба «Віта» ў Смаргонскім раёне — гэта ўжо для тых, хто неабыякавы да вады. Там прапануюць унікальную магчымасць адчуць сябе ў стане бязважкасці, здзейсніўшы заплыў у марскіх камбінезонах ВМФ ЗША, у якіх не адчуваецца холаду нават зімой. Улетку гасцей абяцаюць парадаваць таксама 1–2-дзённыя сплавы на байдарках па рацэ Вілія, пешыя і велапаходы. Акрамя таго, гаспадар запрашае гасцей далучыцца да культуры беларускага народа, наведаўшы зроблены ўласнымі сіламі музей, у якім выстаўлены прадметы старадаўняга беларускага побыту.

Безумоўна, нашы аграсядзібы пакуль выглядаюць па-рознаму. Адны ладкуюцца ў двух-трохпавярховых катэджах, іншыя — у звычайных сельскіх хатах, але пры разумным падыходзе і кемлівасці гаспадароў даюць магчымасць цікавага адпачынку.

Цяпер, калі сціх навагодні ажыятаж, даўшы добры, але часовы прыбытак, гаспадары многіх сядзіб з надзеяй глядзяць на чэмпіянат свету па хакеі, які пройдзе ў нас у маі месяцы. Мяркуюць, што замежныя турысты зацікавяцца не толькі самімі спаборніцтвамі і пражываннем у гарадскіх атэлях і санаторыях, але і аграсядзібамі. Таму не варта дзівіцца, што гэтай зімой дзе-нідзе там цяпер прапануюць і варыянты адпачынку з хакейнай тэматыкай.

Вольга ЦІЦЯНКОВА

■ На слыху

Чэргі на мяжы: пачакаем да лютага?

Сітуацыя з нечакана вялікай колькасцю машын на беларуска-польскай мяжы, якія апошнімі днямі падоўгу не могуць прайсці кантроль і рухацца па сваім маршруце, павінна стабілізавацца ў наступным месяцы.

Пра гэта паведаміў **начальнік упраўлення арганізацыі мытнага кантролю Дзяржаўнага мытнага камітэта Уладзімір АРЛОЎСКІ.**

— Мы прагназуем, што да пачатку лютага ўдасца выйсці на стапрацэнтную прапускную здольнасць, — адзначыў ён. — Сёлета грузапаток пачаў расці хутчэй, чым гэта было ў мінулым годзе. 19 студзеня 2013 года на пункце пропуску «Брузгі» стаяла чарга з 250 машын, сёлета пераходу мяжы чакала ўжо 450 аўто. Гэты момант крыху «зблытаў карты» і не даў плаўна ўвайсці ў рэжым працы па новай сістэме.

Як вядома, з 1 студзеня 2014 года мытныя органы ў Беларусі атрымалі дадатковыя паўнамоцтвы: ажыццяўленне ў аўтадарожных пунктах пропуску транспартнага і санітарна-карантыннага кантролю. Але Уладзімір Арлоўскі падкрэсліў, што супрацоўнікі мытні на выкананне новых для іх абавязкаў затрачваюць столькі ж часу, колькі на гэта ішло і ў прадстаўнікоў транспартнай інспекцыі.

— Па новай сістэме працуем нядаўна, але я не назваў бы гэта асноўнай прычынай стварэння чэргаў, якія цяпер стаяць на мяжы, — удакладніў ён.

Па словах Уладзіміра Арлоўскага, дакладную прычыну ранняга павелічэння грузапатоку назваць складана. Магчыма, гэта звязана з больш кароткімі, чым звычайна, навагоднімі канікуламі ў Расіі. Грузы, якія, зразумела, у выхадныя дні ніхто не прыме, проста раней «паехалі» да месца свайго прызначэння праз тэрыторыю нашай краіны.

Ганна ГАРУСТОВІЧ.

Дапамаглі адчыніць дзверы для медыкаў

Незвычайную дапамогу давялося аказваць барысаўскім выратавальнікам: па просьбе ўчастковага ўрача-тэрапеўта яны дапамаглі ў адчыніць дзверы у кватэру інваліда Вялікай Айчыннай вайны.

— Гаспадар жылля 1920 года нараджэння катэгарычна адмовіўся адчыніць дзверы ўрачу падчас планавага наведвання. Заслужаны чалавек пражывае адзін. Разам з нашымі работнікамі да месца выкліку выехалі брыгада хуткай дапамогі і міліцыя, — паведамілі ў Мінскім абласным упраўленні МНС. — Па аўталесках супрацоўнік РУУС патрапіў праз адчыненае акно ў кватэру і адчыніў дзверы медыкам. Мужчына быў цвярозы. Яго завезлі ў бальніцу для абследавання.

Сяргей РАСОЛЬКА

■ Агракультура

КРОК НАСУСТРАЧ ЭКАЛАГІЧНАЙ ГАСПАДАРЦЫ

УСЁ БОЛЬШ БЕЛАРУСАЎ ВЫКАЗВАЮЦЬ ЖАДАННЕ КУПЛЯЦЬ АРГАНІЧНЫЯ ПРАДУКТЫ, ЧЫМ ТРАЦІЦЦА НА ЛЕКІ

Як правіла, большасць спажыўцоў лічыць, што прадукцыя, купленая на рынку ў фермера ці вясковай бабулькі, экалагічна чыстая. Але дзе гарантыя, што сельскагаспадарчыя культуры не пырскаюць «хіміяй» для атрымання лепшых ураджаяў, а жывёлу не кормяць камбікармамі, каб прыбаўляла ў вазе? Як сведчаць сацыялагічныя апытанні, нашы суайчыннікі дрэнна ўяўляюць працэс атрымання арганічных прадуктаў. Разам з тым, 90% гараджан хочуць харчавацца натуральнымі мясам, малаком, садавіной і гароднінай. На жаль, яны амаль адсутнічаюць у гандлі: арганічная сельская гаспадарка ў краіне практычна ў зародкавым стане.

ВЫПРАБАВАННІ ДЛЯ ПЕРШАПРАХОДЦАЎ

Фізік-электроншчык Дзмітрый Крылоў і яго жонка Галіна, педагог па спецыяльнасці, пераехалі ў Дзяржынскі раён з Мінска. Яны сталі, па сутнасці, першапраходцамі па вырошчванні коз малочнай зааненскай пароды ў Беларусі. У фермерскай гаспадарцы «ДАК» на 100 гектарах зямлі ўтрымліваецца звыш 300 жывёлін. Малако Дзмітрый і Галіна здаюць для перапрацоўкі на завод, будуюць сыраробны цэх. Дзмітрый Аляксандравіч і не думаў займацца арганічнай сельскай гаспадаркай, пакуль не пабываў у Швецыі, дзе экалагічныя прадукты складаюць 60% ад агульнай вытворчасці.

Асвойванне арганічнага земляробства стала для фермераў сапраўдным выпрабаваннем, паколькі давялося адмовіцца ад выкарыстання мінеральных угнаенняў, гербіцыдаў, ядахімікатаў, каб аздаравіць зямлю. З пустазеллем змагаліся дзедаўскімі метадамі — праполкай, а шкоднікаў вынішчалі з дапамогай севазвароту. У выніку гаспадары страцілі ва ўраджайнасці, эфектыўнасці працы. І толькі праз тры гады спецыялісты міжнароднага экспертнага цэнтра «Арганік-стандарт», які знаходзіцца ва Украіне, уручылі ім сертыфікат на зямлю. Паколькі ў Беларусі няма сертыфікуючых органаў, фермерам, што вырашылі займацца арганічнай гаспадаркай, даводзіцца звяртацца да экспертаў ва Украіне, у Латвіі, Расіі. Дарэчы, у заходніх краінах для такой катэгорыі прыватных вытворцаў дзейнічае асобная дзяржаўная праграма, якая прадугледжвае падтрымку і кампенсацыю страт на пераходны перыяд да экалагічнага земляробства.

Сертыфікат арганічнага фермера — толькі першы крок на шляху да атрымання экалагічнага казінага малака. Такі ж дакумент Крыловым трэба атрымаць на сельгаскультуры, а затым — на жывёлу і прадукцыю. Але пакуль яны не могуць сертыфіцыраваць статак. Не хапае натуральных кармоў, і даводзіцца выкарыстоўваць у якасці падкормкі камбікармы, што супярэчыць патрабаванням Еўрасаюза.

НЕ ЗГУБІЦЬ ДРОБНАГА РАМЕСНІКА

Па словах Дзмітрыя Крылова, дзяржава толькі пачала праяўляць цікавасць да арганічнай гаспадаркі. Дэпутаты актыўна падключыліся да стварэння нарматыўнай базы, распрацоўкі сістэмы дзяржаўнай падтрымкі, прыняцця закона аб арганічнай сельскай гаспадарцы. Колькі гадоў таму эксперты сумняваліся ў тым, што беларусы гатовы купляць дарагую арганічную прадукцыю. Цяпер жа людзі сталі багацейшымі і хочуць спажываць экалагічна чыстыя прадукты. «Усё мае свой кошт: ці ты купляеш больш дарагія арганічныя прадукты ці ўкладваеш затым грошы ў лячэнне», — адзначыў Мікалай Іванчанка, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу.



— А пакуль у нас заканадаўства па перапрацоўцы прадукцыі накіравана на контроль буйных вытворцаў. З дзяржаўнага пункту гледжання, гэта правільна, — лічыць Дзмітрый Крылоў. — Але пры гэтым мы губляем дробнага рамесніка, які хоча выпускаць тушонку, вяндліну, кансервы з садавіны і гародніны ды іншае. Вельмі складана прыватнікам вытрымліваць патрабаванні, што прад'яўляюцца да харчовай вытворчасці. Для такой катэгорыі гаспадарнікаў патрэбна асобнае заканадаўства, з іншымі падыходамі, прынцыпамі. Напрыклад, у Еўропе можна выпускаць прадукцыю на кухні, што знаходзіцца літаральна за сцяной фермы. А тамтэйшыя кантралёры ў першую чаргу ацэньваюць вытворцу па тым, ці падтрымлівае ён гігіену, ці вытрымлівае стандарты, рэцэптуру.

Па словах эксперта экалагічнай установы «Агра-Эка-Культура», кандыдата сельскагаспадарчых навук Ланы Семенс, у краіне ўжо ёсць сертыфіцыраваная арганічная гаспадарка, яшчэ сем — на падыходзе. У айчынных арганічных фермераў значна больш цяжкасцяў, чым у звычайных, асабліва ў тых, хто толькі пачынае справу. Па-першае, вельмі цяжка атрымаць крэдыты нават пад высокія працэнты. Па-другое, тормазам на шляху развіцця ў Беларусі арганічнай сельскай гаспадаркі з'яўляецца адсутнасць адпаведнага закона.

Экалагічная ўстанова «Агра-Эка-Культура» сумесна з Цэнтрам экалагічных рашэнняў распрацавала прапановы для падрыхтоўкі праекта закона аб арганічнай вытворчасці на аснове вопыту работы з замежнымі і айчыннымі фермерамі. «Многія беларускія фермеры хочуць стаць арганічнымі, але ім патрэбна дапамога, у тым ліку ў наладжванні сувязяў з сертфіцыруючымі арганізацыямі, з заходнімі калегамі. Наша ўстанова дапамагае вырашыць гэтыя праблемы. Мы ладзім семінары, запрашаем кансультантаў з Украіны, Польшчы, пасылаем фермераў да нашых партнёраў за мяжу, каб яны навучыліся канкрэтным методыкам вядзення арганічнай гаспадаркі», — распаўсюджвае Лана Семенс.

ВЯРНУЦЬ ПРЭСТЫЖ ФЕРМЕРА

На днях Мінск наведаў спецыяліст з сусветным імем у галіне арганічнага земляробства, кіраўнік шэрагу сельскагаспадарчых праектаў, дырэктар фермы Ridgedale PERMACULTURE Рычард Перкінс са Швецыі. Ён расказаў беларускім фермерам, як зрабіць сельскую гаспадарку прыбытковым бізнесам.

— У свой час было вельмі прэстыжна стаць фермерам. Сёння ў Беларусі, зрэшты, як і ва ўсім свеце, фермерства лічыцца непапулярным, а фермеры раяць дзецям атрымліваць іншую адукацыю. Але менавіта з-за такіх адносін мы губляем інтэлектуальны патэнцыял, і ўсё перахадзіць у рукі карпаратыўнай сельскай гаспадаркі. Вырашыць праблему мы імкнёмся шляхам больш карпатлівага падыходу да планавання і праектавання дзейнасці фермераў, — канстатаваў

Колькі гадоў таму эксперты сумняваліся ў тым, што беларусы гатовы купляць дарагую арганічную прадукцыю. Цяпер жа людзі сталі багацейшымі і хочуць спажываць экалагічна чыстыя прадукты.

Рычард Перкінс. — З іншага боку, не менш важная пазіцыя спажыўцоў. Яны павінны больш ведаць, што ўжываюць, і ўстанаўліваць асабістыя кантакты з вытворцамі.

З развіццём інфармацыйных тэхналогій набываюць абароты новыя нетрадыцыйныя метады рэалізацыі прадукцыі. Асабліва гэта датычыцца Злучаных Штатаў Амерыкі, дзе людзі, што аддаюць перавагу здароваму і правільнаму харчаванню, аб'ядноўваюцца ў супольнасці дзякуючы інфармацыйным сеткам. Яны купляюць прадукты ў фермераў, якія атрымалі адабрэнне супольнасці. Фермерам, у сваю чаргу, гэта таксама выгадна: не трэба шукаць рынкі збыту.

Разам з тым, Рычард Перкінс зазначыў, што ён не супраць сертыфікацыі арганічнай прадукцыі. «Магчыма, на першапачатковым этапе для Беларусі гэта будзе значным крокам наперад, дапаможа адпаведным вытворцам назапасіць дадатковы вопыт. Але нельга выключаць і нефармальныя грамадскія сеткі. Усё гэта можа суіснаваць разам, паралельна», — адзначае спецыяліст.

Фермеры, лічыць Рычард Перкінс, павінны займацца той прадукцыяй, якая найбольш адпавядае канкрэтнаму рэгіёну. Многія ж вытворцы імкнуцца прытрымлівацца навязаным ім планам па вырошчванні пэўных відаў прадукцыі, што цалкам ідзе ўразрэз з натуральнымі патрэбнасцямі і магчымасцямі тэрыторый. Для гэтага ім часам даводзіцца нават штучна змяняць умовы сваіх экасістэм. Не сакрэт, што прывезеныя з іншых мясцовасцяў нават высокапрадукцыйныя гатункі раслін і віды жывёл дрэнна прыжываюцца ў чужых умовах. Для іх падтрымкі патрэбны спецыяльныя ўгнаенні, прэпараты, што прыносіць дадатковыя затраты.

Вырошчваць ці не беларускім фермерам неўласцівыя для нашай кліматычнай зоны экзатычныя культуры (напрыклад, персікі, лімоны) — справа асабістая.

— Іх можна вырасціць дзе заўгодна, але трэба змяніць мікраклімат. Адзін з аўстрыйскіх фермераў, фазэнда якога знаходзіцца на вышыні 1,5 тыс. метраў над узроўнем мора, у адкрытым грунце атрымлівае лімоны, чарэшню, шмат фруктаў, якіх у Альпах не сустрэнеш. Ён дасягнуў гэтага шляхам змянення мікраклімату, асабліваым спосабам спраектаваўшы свой участак: выкарыстаў ваду, якая адлюстроўвае сонечнае святло і накіроўвае яго на скалістую паверхню гор, дзе растуць сады. Гэта дазволіла разводзіць і сельскагаспадарчых жывёл, якія гуляюць на волі, — сцвярджае Перкінс. — Тыя ж прадпрымальнікі, што ідуць традыцыйным шляхам, часта прайграюць. Для таго, каб зрабіць крок насустрач экалагічнай сельскай гаспадарцы, варта змяніць сваю свядомасць.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

Закон Рэспублікі Беларусь

АБ УНЯСЕННІ ДАПАЎНЕННЯЎ І ЗМЯНЕННЯЎ У КОДЭКС РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ АБ АДУКАЦЫІ

Прыняты Палатай прадстаўнікоў *5 снежня 2013 года*

Ухвалены Саветам Рэспублікі *19 снежня 2013 года*

Артыкул 1. Унесці ў Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі ад 13 студзеня 2011 года (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011 г., № 13, 2/1795; № 140, 2/1877) наступныя дапаўненні і змяненні:

1. Пункт 6 артыкула 3, пункт 7 артыкула 19, пункт 3 артыкула 21, абзацы пяты і сёмы артыкула 30, пункт 5 артыкула 31, пункт 3 артыкула 32, пункт 2 артыкула 43, пункт 6 артыкула 44, пункт 4 артыкула 48, пункт 6 артыкула 49, пункт 3 артыкула 55, падпункты 1.1 і 1.2 пункта 1 і пункт 2 артыкула 80, падпункт 6.6 пункта 6 і частку другую пункта 8 артыкула 83, частку першую пункта 1 і пункт 8 артыкула 88, частку трэцюю пункта 9 артыкула 94, частку трэцюю пункта 7 артыкула 98, артыкул 129, пункт 7 артыкула 188, частку другую пункта 3 артыкула 203, пункт 4 артыкула 204, пункт 11 артыкула 215 і пункт 4 артыкула 219 пасля слоў «Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь», дапоўніць словамі «Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь,».

2. Артыкул 20 дапоўніць пунктам 2^1 наступнага зместу:

«2^1. Установы агульнай сярэдняй адукацыі ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам, могуць ствараць умовы для арганізацыі вучэбна-трэніровачнага працэсу або арганізоўваць вучэбна-трэніровачны працэс у мэтах падрыхтоўкі спартыўнага рэзерву і (ці) спартсменаў высокага класа. Вучэбна-трэніровачны працэс у мэтах падрыхтоўкі спартыўнага рэзерву і (ці) спартсменаў высокага класа ажыццяўляецца на аснове вучэбных праграм па асобных відах спорту, якія зацвярджаюцца Міністэрствам спорту і турызму Рэспублікі Беларусь, у адпаведнасці з заканадаўствам.».

3. Пункт 5 артыкула 25 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«5. У выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам, ва ўстанове адукацыі ствараюцца і (ці) могуць ствацца іншыя органы самакіравання: педагагічны савет, папячыцельскі савет, бацькоўскі камітэт, трэнерскі савет. Палажэнні аб педагагічным савеце, папячыцельскім савеце, бацькоўскім камітэце ўстановы адукацыі зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь. Палажэнне аб трэнерскім савеце зацвярджаецца Міністэрствам спорту і турызму Рэспублікі Беларусь.».

4. У падпункце 2.7 пункта 2 артыкула 41 словы «наркатычных сродкаў, псіхатропных» замяніць словамі «ўжывання наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх аналагаў».

5. У артыкуле 57:

пункт 7 пасля слоў «праграм» і «здольнасцяў» дапоўніць адпаведна словамі «, выканання вучэбных праграм па асобных відах спорту» і «, адбор асоб, здольных дасягнуць высокіх вынікаў у асобным відзе спорту»;

пункт 15 пасля слоў «Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь,» дапоўніць словамі «Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь,».

6. У артыкуле 79:

падпункт 5.2 пункта 5 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«5.2. невыканання вучэбнай праграмы па асобным відзе спорту, парушэння спартыўнага рэжыму, а таксама ў сувязі з пагаршэннем стану здароўя, якое перашкаджае прадаўжэнню заняткаў выбраным відам спорту (для вучняў сярэдніх школ — вучылішчаў алімпійскага рэзерву, якія асвойваюць змест агульнаадукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, і спецыялізаваных па спорце класаў суворавскіх вучылішчаў);»;

пункт 9 пасля слова «рэзерву» дапоўніць словамі «(суворавскага вучылішча)»;

пункт 11 пасля слоў «Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь,» дапоўніць словамі «Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь,».

7. У падпункце 1.9 пункта 1 артыкула 126 словы «ўжывання наркатычных сродкаў, псіхатропных» замяніць словамі «ўжывання наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх аналагаў».

8. У артыкуле 156:

у пунктах 3–5, 13, 17–22 словы «і ў мэтах спартыўнай падрыхтоўкі вучняў можа арганізоўвацца вучэбна-трэніровачны працэс па відах спорту» замяніць словамі «ствараюцца ўмовы для арганізацыі вучэбна-трэніровачнага працэсу ў мэтах падрыхтоўкі спартыўнага рэзерву і (ці) спартсменаў высокага класа»;

частку першую пункта 7 і частку першую пункта 9 дапоўніць словамі «, ствараюцца ўмовы для арганізацыі вучэбна-трэніровачнага працэсу ў мэтах падрыхтоўкі спартыўнага рэзерву і (ці) спартсменаў высокага класа»;

у пункце 11:

словы «па відах спорту, пачынаючы з VIII» замяніць словамі «ў мэтах падрыхтоўкі спартыўнага рэзерву і (ці) спартсменаў высокага»;

пасля слоў «Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь,» дапоўніць словамі «Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь,»;

у пункце 12:

пасля слоў «Следчым камітэце Рэспублікі Беларусь,» дапоўніць словамі «Дзяржаўным камітэце судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь,»;

словы «і ў мэтах спартыўнай падрыхтоўкі вучняў можа арганізоўвацца вучэбна-трэніровачны працэс па відах спорту» замяніць словамі «, ствараюцца ўмовы для арганізацыі вучэбна-трэніровачнага працэсу ў мэтах падрыхтоўкі спартыўнага рэзерву і (ці) спартсменаў высокага класа»;

у пункце 15 словы «і ў мэтах спартыўнай падрыхтоўкі вучняў або падрыхтоўкі спартыўнага рэзерву і (ці) спартсменаў высокага класа можа арганізоўвацца вучэбна-трэніровачны працэс па відах спорту» замяніць словамі «ствараюцца ўмовы для арганізацыі вучэбна-трэніровачнага працэсу або можа арганізоўвацца вучэбна-трэніровачны працэс у мэтах падрыхтоўкі спартыўнага рэзерву і (ці) спартсменаў высокага класа»;

з пункта 26 словы «па відах спорту» выключыць.

9. У пункце 4 артыкула 157 словы «ствараецца педагагічны» замяніць словамі «ствараюцца педагагічны савет, а ў сярэдняй школе — вучылішчы алімпійскага рэзерву таксама трэнерскі».

10. Частку трэцюю пункта 12 артыкула 158 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Спецыялізаваныя па спорце класы — класы, якія ствараюцца на I, II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі, у якіх рэалізуюцца адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі і ў мэтах падрыхтоўкі спартыўнага рэзерву і (ці) спартсменаў высокага класа для вучняў арганізоўваецца вучэбна-трэніровачны працэс. Палажэнне аб спецыялізаваных па спорце класах зацвярджаецца Міністэрствам спорту і турызму Рэспублікі Беларусь, Міністэрствам абароны Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.»;

11. У артыкуле 159:

у пункце 1 словы «да займання асобным відам спорту (у галіне асобнага віду мастацтва) і (ці) з улікам стану здароўя, спартыўных дасягненняў» замяніць словамі «ў галіне асобных відаў мастацтва, адбору асоб, здольных дасягнуць высокіх вынікаў у асобным відзе спорту, і з улікам стану здароўя»;

у пункце 3:

у частцы першай словы «праверкі здольнасцяў да заняткаў асобным відам спорту пры адсутнасці супрацьпаказанняў да заняткаў спортам» замяніць словамі «адбору асоб, здольных дасягнуць высокіх вынікаў у асобным відзе спорту, пры адсутнасці медыцынскіх супрацьпаказанняў да заняткаў відам спорту»;

частку другую выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Парадак прыёму асоб для атрымання пачатковай адукацыі, базавай адукацыі, сярэдняй адукацыі ў спецыялізаваных па спорце класах, тэрміны, парадак і асаблівасці правядзення адбору асоб, здольных дасягнуць высокіх вынікаў у асобным відзе спорту, вызначаюцца Палажэннем аб спецыялізаваных па спорце класах, калі іншае не вызначана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.»;

пункт 12 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«12. Прыём асоб для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі ў сярэдніх школах — вучылішчах алімпійскага рэзерву ажыццяўляецца па выніках адбору асоб, здольных дасягнуць высокіх вынікаў у асобным відзе спорту, пры адсутнасці медыцынскіх супрацьпаказанняў да заняткаў відам спорту, пералік якіх зацвярджаецца Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.

Парадак прыёму асоб для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі ў сярэдніх школах — вучылішчах алімпійскага рэзерву, тэрміны, парадак і асаблівасці правядзення адбору асоб, здольных дасягнуць высокіх вынікаў у асобным відзе спорту, вызначаюцца Міністэрствам спорту і турызму Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Для арганізацыі прыёму асоб у сярэднія школы — вучылішчы алімпійскага рэзерву для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі, правядзення адбору асоб, здольных дасягнуць высокіх вынікаў у асобным відзе спорту, і фарміравання па яго выніках кантынгенту вучняў ствараецца прыёмная камісія.

Асобы, якія бяруць удзел у адборы для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі ў сярэдніх школах — вучылішчах алімпійскага рэзерву, падаюць у прыёмную камісію сярэдніх школ — вучылішчаў алімпійскага рэзерву акрамя дакументаў, прадугледжаных пунктам 1 гэтага артыкула, дакументы, пералік якіх вызначаецца Міністэрствам спорту і турызму Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.».

12. Дапоўніць Кодэкс артыкулам 162^1 наступнага зместу:

«Артыкул 162^1. Навучанне і выхаванне вучняў, якія бяруць удзел у спартыўных мерапрыемствах

1. Вучням, якія асвойваюць змест адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі і бяруць удзел у спартыўных мерапрыемствах па-за месцам знаходжання ўстановы адукацыі, у якіх яны вучацца, ствараюцца ўмовы для навучання і выхавання ў выпадках і парадку, якія вызначаюцца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам спорту і турызму Рэспублікі Беларусь.

2. Навучанне і выхаванне вучняў у перыяд удзелу іх у спартыўных мерапрыемствах па-за месцам знаходжання ўстановы адукацыі, у якіх яны вучацца, арганізоўваюцца ўстановамі адукацыі па месцы правядзення спартыўных мерапрыемстваў.

3. Рашэнне аб навучанні і выхаванні вучня ва ўстанове адукацыі на перыяд удзелу ў спартыўным мерапрыемстве прымаецца мясцовым выканаўчым і распарадчым органам па месцы правядзення спартыўнага мерапрыемства на падставе звестак, якія падаюцца арганізатарам спартыўнага мерапрыемства.».

13. Падпункт 7.2 пункта 7, пункты 9 і 13 артыкула 167 выключыць.

14. Артыкул 190 дапоўніць пунктам 3 наступнага зместу:

«3. Тэрмін атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі пры асваенні зместу адукацыйнай праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі, якая забяспечвае атрыманне кваліфікацыі спецыяліста з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, для вучняў сярэдніх школ — вучылішчаў алімпійскага рэзерву па рашэнні заснавальніка сярэдняй школы — вучылішча алімпійскага рэзерву можа быць павялічаны па прычыне ўдзелу на працягу навучальнага года ў складзе нацыянальных і зборных камандаў Рэспублікі Беларусь па відах спорту ў спартыўных мерапрыемствах не больш чым на два гады.».

Артыкул 2. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь у шасцімесячны тэрмін прыняць захады па рэалізацыі палажэнняў гэтага Закона.

Артыкул 3. Гэты Закон уваходзіць у сілу ў наступным парадку:

артыкул 1 — праз шэсць месяцаў пасля афіцыйнага апублікавання гэтага Закона;

іншыя палажэнні — пасля афіцыйнага апублікавання гэтага Закона.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
А. Лукашэнка

4 студзеня 2014 года, г. Мінск.
№ 126-З

■ Інфарм-укол

ВЫХОДЗІМ НА МАРОЗ

Абмаражэнне ўзнікае часцей за ўсё з-за празмернай упэўненасці ў тым, што тэмпература навакольнага асяроддзя (холад, мароз) не можа значна нашкодзіць арганізму. Чамусьці многія забываюцца на простыя ісціны, здольныя захаваць здароўе і жыццё. Урач-валеолаг Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Леанід МЯЛЕШКА нагадвае, што і як рабіць.

1. Вопратка. Насіце не проста цёплую, але свабодную вопратку — якая спрыяла б нармальнай цыркуляцыі крыві. Варта апранацца па прынцыпе «капусты», каб паміж «слаямі» была праслойка паветра, здольная затрымліваць цеплыню. Важна, каб усе слаі былі лёгкімі і воданепранікальнымі, паколькі мокрае адзенне павялічвае рызыку абмаражэння. Не выходзьце на мароз без рукавіц, шапкі і шаліка. Лепшы варыянт — рукавіцы з тканіны, якая не прапускае вільгаць і не прадзімаецца. Пальчаткі з натуральных матэрыялаў хоць і зручныя, але ад марозу не ратуюць. Шчокі і ніз твару можна абараніць шалікам. У ветранае халоднае надвор'е перад выхадам на вуліцу адкрытыя ўчасткі цела змажце спецыяльным крэмам. Не насіце на марозе металічных, у тым ліку залатых і сярэбраных упрыгажэнняў (пярсцёнкі, завушніцы). Метал астывае значна хутчэй за цела, у выніку чаго магчымае «прыліпанне» да скуры і халадовыя траўмы. Па-другое, пярсцёнкі толькі тармозяць нармальную цыркуляцыю крыві.

2. Абутак. Не варта насіць надта цесны абутак, які сціскае сасуды, што павялічвае верагоднасць абмаражэння. Ногі больш за ўсё схільныя да ўздзеяння нізкіх тэмператур, паколькі ўвесь час знаходзяцца ў пастаянным кантакце з паверхняй зямлі. У выпадку працяглых прагулак перыядычна сціскайце і расціскайце пальцы на нагах, каб палепшыць краваток. Вельмі важна, каб абутак быў сухі. У абутку павінны быць цёплыя вусцілкі, шкарпэткі — шарсцяныя.

3. Ежа. Рэкамендуецца цёплая і досыць каларыйная. Халодная ежа нашмат горш засвойваецца і патрабуе дадатковай энергіі для ператраўлівання і саграванння ў арганізме. Калі ж вам у экстрэмальных умовах даводзіцца здавольваць халодным пайком, імкніцеся дасканала жаваць ежу, паступова саграваючы яе. Больш піце, пажадана цёплыя напоі. Вада паляпшае кровазварот і павялічвае тым самым забеспячэнне цеплынёй усяго арганізма. Нельга забываць, што алкаголь выклікае вялікія страты цеплыні і ў той жа час — ілюзію цеплыні. Дадатковым фактарам з'яўляецца немагчымасць сканцэнтраваць увагу на прыкметах абмаражэння. Курэнне на марозе таксама непажаданае, паколькі ў працэсе звужаюцца дробныя сасуды, пагаршаецца мікрацыркуляцыя крыві, і гэта робіць канечнасці ўразлівымі.

✓ Сачыце за колерам твару, вушэй, носа і шчок вашага сябра, а ён няхай «назірае» за вашымі.

✓ Не дазваляйце абмарожанаму месцу зноў замерзнуць — гэта пагражае больш значным пашкоджаннем скуры.

✓ Не знімайце на марозе абутак з абмарожаных канечнасцяў — яны распухнуць і вы не зможаце зноў надзець яго. Неабходна як мага хутчэй дайсці да цёплага памяшкання. Калі змерзлі рукі, паспрабуйце адагрэць іх пад мышкамі.

✓ Вярнуўшыся дадому пасля працяглай прагулкі па марозе, абавязкова пераканайцеся ў адсутнасці абмаражэння канечнасцяў, спіны, вушэй, носа. Пушчанае на самацёк абмаражэнне можа прывесці да гангрэны і наступнай ампутацыі.

✓ Як толькі на прагулцы вы адчулі пераахаладжэнне, неабходна як мага хутчэй зайсці ў любое цёплае месца, каб сагрэцца і агледзець найбольш уразлівыя для марозу месцы.

✓ Калі ў вас заглухла машына ў незнаёмай мясцовасці або ўдалечыні ад населенага пункту, лепш за ўсё ў чаканні дапамогі, іншага аўтамабіля заставацца ў машыне.

✓ Хавайцеся ад ветру: верагоднасць абмаражэння на ветры значна вышэйшая.

✓ Не мачыце скуру: вада праводзіць цеплыню значна лепш за паветра. Не выходзьце на мароз з вільготнымі валасамі. Калі чалавек, скажам, упаў у ваду, мокрае адзенне неабходна зняць, ваду выцерці, пераапрануцца ў нешта сухое і тэрмінова накіравацца туды, дзе цёпла. У лесе, напрыклад, трэба распрануцца і высушыць адзенне, а ў час чакання — энергічна рабіць фізічныя практыкаванні каля агню.

✓ Адпраўляючыся на працяглую прагулку на марозе, трэба прыхапіць з сабой пару шкарпэтак на змену, рукавіцы і тэрмас з гарачым чаем. Перад выхадам неабходна паесці.

✓ Варта ўлічваць, што ў дзяцей тэрмарэгуляцыя арганізма яшчэ не поўнасцю настроена, а ў пажылых людзей і пры некаторых захворваннях гэтая функцыя бывае парушана. Такія катэгорыі схільныя да пераахаладжэння і абмаражэння. Дзецям праз кожныя 15–20 хвілін гульні на вуліцы пажадана вяртацца ў цеплыню і сагравацца.

ПЕРШАЯ ДАПАМОГА НА МАРОЗЕ:

1. Даставіць пацярпелага ў цёплае памяшканне. Зняць абутак, шкарпэткі, пальчаткі. Выклікаць хуткую дапамогу.

2. Пры лёгкай ступені абмаражэння. Сагрэць пераахаладжаныя ўчасткі цёплымі рукамі, лёгкім масажам, расціраннем, дыханнем, шарсцяной тканінай, пакласці ватна-марлевую павязку.

Пры абмаражэнні 2–4 ступеняў. Хуткае саграванне, масаж і расціранне рабіць не трэба. Пакладзіце на паверхню слой марлі, затым тоўсты слой ваты, пасля зноў марлі, а зверху — цырату (павязка, якая забяспечыць цяплоізаляцыю). Пашкоджаныя канечнасці фіксуюць з дапамогай падручных сродкаў (дошчачкі, фанеры, тоўстага кардону) — накладваюць і прыбінтоўваюць паверх павязкі. У якасці ізалюючага цяпло матэрыялу можна выкарыстоўваць ватнік, фуфайку, шарсцяную тканіну.

3. Пацярпеламу трэба даць цёплае пітво, гарачую ежу, па 1 таблетцы аспірыну, анальгіну, па 2 таблеткі «Но-шпа» і папаверыну.

4. Не рэкамендуецца расціраць снегам, паколькі сасуды канечнасцяў можна лёгка пашкодзіць, а мікратраўмы скуры паспрыяюць занясенню інфекцыі. Нельга выкарыстоўваць хуткае адаграванне абмарожаных канечнасцяў каля вогнішча, прымяняць грэлкі, паколькі гэта пагоршыць працяканне абмаражэння. Нельга прымяняць для расцірання алеі, тлушчы, спірт.

5. Пры агульным пераахаладжэнні лёгкай ступені дастаткова сагрэцца ў цёплай ванне пры пачатковай тэмпературы вады 24 градусы, якую павысіць паступова да нармальнай тэмпературы цела. У больш цяжкіх выпадках пацярпелага неабходна даставіць у бальніцу.

Святлана БАРЫСЕНКА

■

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 27 февраля 2014 года проводит 2-ой открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

Номера лотов	Наименование техники	Местонахождение объекта	Начальная цена продажи (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)
14	Экскаватор ЭОВ-4421 № 910406 на КрАЗ-255Б ш. 706811 дв. 17918 1991 г. 4 кат. 627 м/ч	г. Слуцк ООХДиР, в/ч 52242	340 000 000	34 000 000
15	Грузовой КамАЗ-4310 ш. 019914 дв. 910321 1986 г. 3 кат. 94010 км	г. Полоцк, в/ч 55719	50 000 000	5 000 000
16	Грузовой КамАЗ-4310 ш. 05568 дв. 0606337 1984 г. 3 кат. 93635 км	г. Полоцк, в/ч 55719	50 000 000	5 000 000
17	Грузовой Урал-4320-0010-01 ш. 167540 дв. 739314 1991 г. 3 кат. 111510 км	г. Слоним, в/ч 33933	45 000 000	4 500 000
18	Грузовой Урал-43202 ш. 089954 дв. 200024 1988 г. 3 кат. 96520 км	г. Слоним, в/ч 33933	40 000 000	4 000 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж **27 февраля 2014 г. в 11.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до **17.00 24 февраля 2014 года**.

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3-х дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5**-ти банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10**-ти банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012244970018 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр. Машерова, 29, код 153001739, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС**. **Справки по тел.: (017) 398 07 81, факс (017) 398 07 81. Наш адрес в интернете: www.bsk.by, mail@bsk.by.**

Ликвидатор СП «ИППА» УНП 400090242 Журов Вячеслав Алексеевич извещает, что свидетельство о государственной регистрации СП «ИППА», извещение УНН, печать и штампы СП «ИППА» **признать недействительными.**

Утерянный представительством Белгосстраха по Центральному району г. Минска бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу серии БЛБ № 0734114 **считать недействительным.**

УНП 101883943

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Открытого акционерного общества «Слуцк-Модуль» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже имущества (в комплексе) в составе:

№	наименование	инв. №	общ. пл., кв.м
1	Здание инженерно-бытового корпуса, инв. № 98318	640/С-84380	10378,5
2	Тепловые сети, инв. № 98342	640/С-84368	-
3	Площадка асфальтобетонная (инв. № 98364)	640/С-84443	1612,5
4	Погрузочно-разгрузочная площадка (инв. № 98365)	640/С-84378	783,6
5	Трансформаторная подстанция	640/С-84444	37,7
6	Сети водопровода (инв. № 98340, инв. № 98339, инв. № 98341)	640/С-84373	-
7	Канализационная насосная станция (инв. № 98330)	640/С-84377	25,2
8	Эстакада – площадка для мойки автомобилей	640/С-84445	-
9	Топливно-заправочный пункт (инв. № 98327)	640/С-84371	-
10	Очистные сооружения дождевых стоков (инв. № 98331)	640/С-84365	-
11	Градирня металлическая ККТ-35 (инв. № 25301)	640/С-84372	-
12	Градирня металлическая ККТ-35 (инв. № 25300)	640/С-84367	-
13	Контрольно-пропускной пункт	640/С-84440	8,1
14	Склад газовых баллонов	640/С-84442	107,8
15	Вспомогательный корпус часть, инв. № 98358	640/С-84381	1353,6
16	Объекты благоустройства	640/С-84370	-
17	Главный корпус инв. № 98319	640/С-84382	22590,0
18	Здание вспомогательного корпуса, инв. № 98360	640/С-51701	335,7
19	Склад тяжелых металлов	640/С-39784	634,6
20	Здание склада	640/С-38241	535,9
21	Производственное здание-котельная, инв. № 98361	640/С-51700	194,3
22	Гараж со вспомогательным корпусом	640/С-47756	1362,3
23	Здание склада	640/С-38242	2467,1
24	Здание информационно-вычислительного центра	640/С-38243	2393,6
25	Автомонтажный корпус	640/С-39783	8785,1
26	Дренажная насосная станция (инв. № 98329)	640/С-84375	330,6
27	Сети канализации (инв. № 98626)	640/С-84379	-
28	Оборудование согласно перечню (перечень находится у организатора аукциона)		

Указанные объекты расположены на земельном участке, площадью **8,4478 га** (предоставлен на праве постоянного пользования) с кадастровым номером 624650100001006603, по адресу: **Минская область, Слуцкий район, г. Слуцк, ул. 14 Партизан, д. 101.**

Земельный участок имеет ограничения в использовании: зона санитарной охраны поверхностных и подземных источников водоснабжения хозяйственно-питьевого назначения на площади 8,4478 га. Имущество сдается в аренду (сведения об арендаторах можно получить у продавца и организатора аукциона).

Начальная цена с НДС – 62 640 867 840 бел. руб.

Задаток 5% от начальной цены (3 523 548 816 бел. руб.), перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, УНП 690324015.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» от 09.01.2014.

Аукцион состоится **07.02.2014** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **06.02.2014** до 16.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, (8029) 102 21 17.

УНП 600074992

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Открытого акционерного общества «Вишнёвка-2010» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже недвижимого имущества в составе:

ЛОТ № 1:

ОДНОЭТАЖНОЕ КИРПИЧНОЕ ЗДАНИЕ СВИНОФЕРМЫ С ДВУМЯ НАВЕСАМИ И ДВУМЯ ПЛОЩАДКАМИ ДЛЯ ВЫГУЛА, общ. пл. 922,5 кв.м (инв. № 600/С-128522), ОДНОЭТАЖНОЕ КИРПИЧНОЕ ЗДАНИЕ СВИНОФЕРМЫ С ДВУМЯ НАВЕСАМИ, общ. пл. 832,6 кв.м (инв. № 600/С-128558), ОДНОЭТАЖНОЕ КИРПИЧНОЕ ЗДАНИЕ СВИНОФЕРМЫ, общ. пл. 1232,2 кв.м (инв. № 600/С-128550), ОДНОЭТАЖНОЕ КИРПИЧНОЕ ЗДАНИЕ СВИНОФЕРМЫ С ПРИСТРОЙКОЙ, общ. пл. 4299,6 кв.м (инв. № 600/С-128523), ОДНОЭТАЖНОЕ КИРПИЧНОЕ ЗДАНИЕ КОРМОЦЕХА СТФ С ДВУМЯ НАВЕСАМИ, общ. пл. 280,2 кв.м (инв. № 600/С-128968), ОДНОЭТАЖНОЕ КИРПИЧНО-БЛОЧНОЕ ЗДАНИЕ КАРТОФЕЛЕХРАНИЛИЩА, общ. пл. 546,8 кв.м (инв. № 600/С-128590), ВЕСОВАЯ СТФ «УГЛЯНЫ», СОСТОЯЩАЯ ИЗ ДВУХ БЫТОВЫХ ПОМЕЩЕНИЙ И НАВЕСА (инв. № 600/С-128965), ЛЕТНИЙ ЛАГЕРЬ СТФ «УГЛЯНЫ» (инв. № 600/С-128983).

Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 623688200001000324, площадью 6,2289 га (предоставлен на праве постоянного пользования для ведения товарного хозяйства) по адресу: **Минская область, Минский район, Юзуфовский с/с, д. Угляны.**

Начальная цена с НДС – 11 028 867 600 бел. руб.

Задаток 10% от начальной цены (1 102 886 760 бел. руб.)

ЛОТ № 2:

ОДНОЭТАЖНОЕ КИРПИЧНОЕ ЗДАНИЕ ЦЕХА ПО УБОЮ И ПЕРЕРАБОТКЕ СКОТА С ДВУМЯ ПРИСТРОЙКАМИ, общ. пл. 379,9 кв.м (инв. № 600/С-73981), ОГРАЖДЕНИЕ ТЕРРИТОРИИ ИЗ Ж/Б ПЛИТ, протяженностью 272 м.

Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 623688200001000125, площадью 0,4123 га по адресу: **Минская область, Минский район, Юзуфовский с/с, район д. Угляны.**

Начальная цена с НДС – 1 078 111 200 бел. руб.

Задаток 10% от начальной цены (107 811 120 бел. руб.) перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **25.02.2014** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **24.02.2014** до 16.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, (8029) 102 21 17.

УНН 600041880

ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)
Республика Беларусь, 220007,
г. Минск, ул. Московская, 14
Тел.: (+375 17) 309 15 15,
(+375 29) 309 15 15,
(+375 33) 309 15 15

СВЕДЕНИЯ О РЕЗУЛЬТАТЕ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

«Будь впереди с ВТБ и Visa»

Организатор рекламной игры: ЗАО Банк ВТБ (Беларусь), УНП 101165625, г. Минск, ул. Московская, д. 14. Лицензия на осуществление банковской деятельности № 23 от 31.05.2013 г., выдана Национальным банком Республики Беларусь.

Наименование рекламной игры – «Будь впереди с ВТБ и Visa».

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 2213, выдано Министерством торговли Республики Беларусь 29 июля 2013 года.

Срок проведения рекламной игры «Будь впереди с ВТБ и Visa»: с 1 августа 2013 года по 28 февраля 2014 года, включая период розыгрыша, период вручения и действия сертификатов на покупку товаров.

Территория проведения рекламной игры – Республика Беларусь.

Число участников, выполнивших условия рекламной игры, составило 74215 человек.

В рекламной игре разыгрывались сертификаты на приобретение следующих видов товаров: 5 планшетов, 5 телевизоров, 10 домашних кинотеатров, 10 нетбуков, 15 смартфонов, 15 фотоаппаратов. Призовой фонд был разыгран полностью.

Победители, выигравшие сертификат на приобретение планшета: Болтенков О. А., Козылев С. Н., Каленик С. Н., Виноградов С. Н., Бобровский С.П.

Победители, выигравшие сертификат на приобретение телевизора: Чирич П. А., Вересович С. В., Прибыльский Д. А., Крек А. В., Долгова Е.А.

Победители, выигравшие сертификат на приобретение домашнего кинотеатра: Михальчук Ю. Е., Каверин И. В., Бесланеев Р. Ю., Клещенко Г. Л., Зинакова Л. Б., Киселевич Н. Ф., Ясюченя А. В., Куратникова С. С., Соболевский А.А., Гизай Д.В.

Победители, выигравшие сертификат на приобретение нетбука: Дешко С. А., Терещенко Ю. М., Крючков А. А., Лапицкая С. А., Тетюев В. А., Никитюк А. В., Титок В. П., Рысник С. С., Нициевский А.А., Гуськова А.И.

Победители, выигравшие сертификат на приобретение смартфона: Колпаков М. Л., Селезнев В. Г., Колб Е. В., Бондаренко А. И., Северинчик И. В., Павлов А. Г., Мартынов В. Н., Чепанис Е. Г., Сочилович Д. А., Николаева Е. Л., Тинькевич П. А., Мурашевская Ю. И., Суслова Г.А., Герасименко Т.В., Абрамович А.Т.

Победители, выигравшие сертификат на приобретение фотоаппарата: Попов А. В., Васюкович А. В., Мазуркевич А. А., Алексеев А. М., Бычков В. А., Протас А. А., Трояновская Н. В., Мелешко М. Е., Жуковец М. В., Гардей Ю. А., Качан В. Е., Фицнер А. И., Метлицкий И.Ю., Севрюк Е.О., Прибора Е.В.

Информацию по вопросам проведения Рекламной игры можно получить по телефонам (017, 029, 033) 309-15-15 пн.–пт. 9.00–19.00, сб. 10.00–16.00 (кроме воскресенья и праздничных дней).

ЗАО Банк ВТБ (Беларусь) УНП 101165625.

Управляющий в деле о банкротстве ЧТУП «Мельник Н.В.» (УНП 490795026, дело №35-3Б\2012\4 в Экономическом Суде Гомельской области) Журов Вячеслав Алексеевич извещает, что первый аукцион по продаже имущества ЧТУП «Мельник Н.В.», назначенный на 31.12.2013 г., признан состоявшимся, претендентом на покупку признана Силистрович Наталья Васильевна (г.п. Лоев, ул. Синякова, д. 18, кв. 12).

Утерянные представительством Белгосстраха по Ленинскому району г. Минска бланки страховых полисов по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь серии ВР №№ 1771624, 1771634 **считать недействительными.**

УНП 100122726

■ Галопам па Еўропах

ПАРЫЖ ВАРТЫ ІМШЫ?

Кажуць, менавіта гэтыя словы («Paris vaut bien une messe») сказаў пратэстант Генрых Наварскі, калі ў яго з'явілася магчымасць трапіць на французскі трон — пры ўмове пераходу ў каталіцтва. Такім чынам у гісторыю Еўропы ўвайшла каралеўская дынастыя Бурбонаў, а Генрых IV стаў яе пачынальнікам. Сёння іншыя часы, іншыя і норавы. І з веравызнаннем ўсё заблытана. Прынамсі, такое ў мяне склалася ўражанне падчас наведвання ў калядныя снежаньскія дні сталіцы Францыі — краіны, якая заўсёды пазіцыянавалася як каталіцкая.

Сённяшнія грамадзяне Францыі.

Мне, праваслаўнай, было цікава, як святкуюць Раство заходнія хрысціяне. Не задавальняцца ж толькі чуткамі, што гэтае свята прагматыкі паставілі калісьці на камерцыйныя рэйкі і так яно па іх упэўнена коціцца... Таму, калі ўязджалі раніцай у Парыж, круціла галавой па баках — каб не прапусціць нешта цікавае.

Прадавец каштанаў у Парыжы.



На патрэбы сённяшняга насельніцтва арыентавана сучасная fashion-індустрыя.

Пабачыла некалькіх цемнаскурых людзей, якія адпачывалі ў тэлефонных будках, на лаўках, загарнуўшыся ў коўдры. Позірк чапляўся за вялізную колькасць прыпаркаваных пракатных матацыклаў, веласіпедаў на надзвычай пустых вуліцах а палове адзінацатай раніцы. Рэдкія машыны ў горадзе, які з прыгарадам налічвае больш за 10 мільёнаў жыхароў. Ёсць версія, што ўсе паехалі сустракаць Раство за горад. Няхай так, але чаму няма ніякіх святочных упрыгажэнняў? Цэнтр у гэтым сэнсе ад ускраін практычна не адрозніваецца. Будзённа; шэра вакол, толькі зрэдку на акне ці ў вітрыне можна пабачыць нейкія атрыбуты свята: ёлку, цацкі, Санта Клауса. Можа, крызіс прымушае эканоміць? Хутчэй за ўсё, іншае. Не трэба асаблівых даследаванняў, дастаткова проста на твары людзей паглядзець, каб зразумець, што гэта — не іх свята. Вядома ж, калісьці амаль палова Афрыкі была калоніяй Францыі. Сёння, відаць, усе нашчадкі былых рабоў прыехалі да колішніх нявольнікаў у госці — ды так і засталіся. Толькі вось святы ў іх — зусім іншыя.

Дадам, што вечарам у горадзе ўсё ж можна назіраць святочную ілюмінацыю, але ж не паўсюль. У цэнтры, там, дзе звычайна ходзяць турысты, — напрыклад, на Елісейскіх палях. Дарэчы, гэта зусім не далёк, а працяглая вуліца, дзе да ночы ідзе актыўны гандаль — у святочныя дні Раства натоўп такі ж, як на нашых «Дажынках».

Між іншым, на патрэбы менавіта сённяшняга насельніцтва Францыі відавочна арыентавана сучасная fashion-індустрыя. На рэкламе — прыгожыя жанчыны ў мусульманскіх хустках побач з імёнамі славутых дызайнераў адзення. І манекены ў Парыжы — амаль усе — чорнага колеру.

Знакамітыя ядомыя каштаны ў Францыі смажаць на невялікіх, зробленых з металічнага бака жароўнях проста на вуліцы. Вось толькі мяне трохі збянтэжылі санітарныя ўмовы, таму пакаштавала іх ужо ў Італіі, дзе, падалося, некалькі лепш арганізаваны гэты нескладаны кулінарны працэс. 3-5 еўра — і паўтара-два дзясяткі невялічкіх цёплых «бульбінак» у шалупінні насыпаны ў папяровы кулёк. Паводле смаку таксама нагадвае бульбу, толькі саладкаватую. Кажуць, каштаны вельмі карысныя.

У рэстаранчыку, куды зайшлі адзначыць Раство, мы нечакана даведаліся, адкуль пайшоў вядомы выраз «накіряться». Нам прапанавалі заказаць «кір» — сумесь белага сухога віна з салодкім чорнапарэчкавым лікёрам. Сапраўды, у галаву дае вельмі хутка, становіцца цёпла і весела, але ж (калі своечасова спыніцца) ніякіх наступстваў не будзе. Выйшлі праз гадзіну — быццам і не ўжывалі. Між тым, еўрапейцы імкнуцца адпачываць у кавярнях, але звонку. Менавіта таму не толькі летам, але і цяпер адкрытыя пляцоўкі, дзе ўжываюць ежу, знаходзяцца амаль побач з праезнай часткай, займаючы ледзь не ўвесь тратуар. У некаторых выпадках даводзілася ісці практычна па нагах наведвальнікаў кавярняў. Але яны, загорнутыя ў пледы, нават увагі на такія дробязі не звярталі.

Многія французы відавочна зацікаўлены ў здаровым ладзе жыцця: мы паўсюль, асабліва ўздоўж Сены, сустракалі прыхільнікаў бегу. Акрамя таго, пажылыя людзі для падтрымання формы выкарыстоўваюць спецыяльныя палкі для хады — каб нагрузка была не толькі на ногі, але і на рукі. Што тычыцца веласіпедаў, здаецца, уся Еўропа даўно і добра асэнсавала іх карысць — і для здароўя, і для выратавання экалогіі. Дарэчы, паўсюль абсталяваны спецыяльныя дарожкі для гэтага віду транспарту, таму нікому ніхто не замінае і кіроўцы не вымаўляюць тых «добрых» слоў у іх адрас, як нашы. Ды і двухколавыя машыны, як і самі веласіпедысты, звычайна свецяцца з усіх бакоў не горш, чым навагоднія ёлкі — не заўважыць нельга. Мяне вельмі ўразілі капялюшыкі веласіпедыстаў з мільгаючымі лямпачкамі.

Складана было не заўважыць і вялікую колькасць вельмі папулярных на Захадзе малалітражак. Гэтыя «лялечныя» і вельмі пранырлівыя міні-аўто выпускаюць сёння амаль усе вядомыя вытворцы. «Смарцікаў» і ім падобных цэняць прагматычныя еўрапейцы: за эканомнасць, кампактнасць, лёгкую паркоўку. Такія машынкі, між тым, дастаткова хутка рухаюцца. Што тычыцца астатніх аўто, тут відавочны патрыятызм. Купляюць французскія ў Францыі, нямецкія — у Германіі, італьянскія — у Італіі. А вось чэхам дастаецца тое, на чым іх заходнія сябры па Еўрасаюзе паспелі паездзіць.

Увогуле, Еўропа любіць разнастайнасць. Таму тут ездзяць на ўсім, што можа рухацца. Адкрытыя зверху аўтобусы прызначаны для правядзення экскурсій. Для тых, хто хоча прыватна і цішэй, — веларыкшы і конныя экіпажы. Для прыхільнікаў экзотыкі — рарытэтныя аўто. Для зусім смелых і бесклапотных — самакаты. Прынамсі, апошнім дарослыя людзі аддаюць перавагу народуні з дзецьмі.

На кожным прыпынку грамадскага транспарту ўсталявана электроннае табло. І сапраўдныя еўрапейцы будуць усхваляваны, калі трамвай ці аўтобус прыйдзе на 30 секунд (!) раней ці пазней за вызначаны час. Усё павінна быць толькі ў адпаведнасці з дакладным раскладам руху. Нам гэта цяжка зразумець.

Між тым, на святочную службу ў Нотр-Дам дэ Пары (Notre Dame de Paris) мы ўсё ж трапілі. Людзей, якія маліліся, было шмат. Але ж не настолькі, каб нельга было прайсці. Таму была нядоўгая магчымасць разгледзець адзін з сапраўдных цудаў Францыі. Споведзь ідзе за шклянымі дзвярыма. На іх напісана не толькі імя святара, але і мовы, на якіх спаведнік можа адкрыць сваю душу. Усё, што адбываецца ўнутры сабора Парыжскай Божай Маці, транслюецца на вялізны экран звонку. Ахвяраванні, як і ў нас, пакідаюць у якасці свечак — коштам 5 еўра. Амаль усе мінімальныя выдаткі пачынаюцца з гэтай сумы, таму не трэба пералічваць яе на нашы грошы. У Еўропе і заробкі трохі іншыя.

Непрададзеныя елкі каля адной з вялікіх крам сумавалі, што так і не сталі навагоднім упрыгажэннем. Падняцца на Эйфелеву вежу не атрымалася: ахвотных занадта шмат, а таму ў чарзе трэба стаяць не менш за 2 гадзіны — у нас столькі часу не было. Мы развітваліся са снежаньскай Францыяй і накіраваліся ў паўночную Італію...

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
Фота аўтара

Транспарт на любы густ.

Елісейскія палі ноччу.

■ Нефармат

КАЛІ СУД — НЕ СПРАВА

З суда я вярталася нібы выціснуты лімон, быццам мяне там судзілі, а не разбіралі звычайную справу — канфлікт паміж кіраўніцтвам кааператыва і жыхаркай дома. Апошняя настойліва прасіла карэспандэнта пабываць на тым судзе. Канфлікт распачаўся не сёння і, падобна на тое, будзе доўжыцца бясконца. Да канкрэтнай прэтэнзіі па рамонце даху дома падчас судовага разбіральніцтва дадаліся дзясяткі іншых з абодвух бакоў. Бакі шукалі кампрамат адзін на аднаго, дзе толькі магчыма. Было відаць, што ў суддзі здавалі нервы: «Я вам соты раз тлумачу: гэта да справы не адносіцца», — прамаўляла яна амаль стальным голасам. Але ісцец і адказчык сталі на сваім.

Цікава, што высветліць, ці быў праведзены належны рамонт таго злашчаснага даху, так і не давялося. Упраўленне ЖКГ, куды звярнуўся суд з просьбай правесці такую экспертызу, адказала, што не мае паўнамоцтваў правяраць кааператывы. Дзяржкантроль таксама адмовіўся, спаслаўшыся на свае нарматыўныя дакументы. Кола замкнулася. Засталося толькі замовіць незалежную экспертызу за грошы істца альбо адказчыка. А ім гэта трэба? Не, вядома. У іх былі лісты з подпісамі. Як аказалася, адна частка жыльцоў дома падтрымлівае істца, другая — адказчыка. Пайдзі разбярыся.

На тым судзе я не заняла нічыю пазіцыю, таму і не называю прозвішчаў, пасад і адрасоў. А вось у прававой непісьменнасці нашых грамадзян давялося ўпэўніцца лішні раз. Кіраўніцтва кааператыва прасілі прынесці дакументы — копіі плацежных даручэнняў на аплату выкананых работ. Яны гэтага чамусьці не зрабілі, а на словах даказвалі, што ўсё зроблена як след. А што не зроблена, за тое і не плацілі. Грамадзянку прасілі прад'явіць доказы таго, аб чым яна сцвярджае. У яе таксама апошніх не было. Дапускаю, што ў кааператыве ёсць нямала парушэнняў, у тым ліку фінансавых. Але для гэтага існуе рэвізійная камісія. Калі апошняя складаецца спрэс са «сваіх» людзей, трэба ініцыяваць агульны сход і аказваць недавер кіраўніку кааператыва альбо збіраць подпісы за перавод жылля пад юрысдыкцыю дзяржаўнай структуры. На сёння іншага выйсця няма. Вынесці ж судовае рашэнне на падставе таго, што Іван Пятровіч альбо Ганна Іванаўна — дрэнныя людзі, немагчыма. І вось гэтага людзі ніяк не хочуць разумець. Таму і б'юцца за сваю праўду па сваім разуменні: абіваюць парогі кіруючых кабінетаў, пішуць лісты ва ўсе інстанцыі.

... Ішла я з таго суда і думала, што вырашэнне любога канфлікту ў судзе сёння — гэта і сучасна, і цывілізавана. Толькі я б не хацела гэтага рабіць ні пры якіх абставінах. Няхай прававую дзяржаву будуе хто-небудзь іншы.

Цяпер і чытачам, напэўна, не буду так настойліва прапаноўваць несці ў суд свае жыццёвыя праблемы. Хоць у зямельных спрэчках гэта ўсё ж часта ўяўляецца ці не адзіным выйсцем. Вось і нядаўна тэлефанаваў чалавек з Івацэвіцкага раёна і добрыя паўгадзіны расказваў, які дрэнны яго сусед, як нахабна адхапіў ён частку пляцу заяўніка, як вядзе сваю гаспадарку, не лічачыся з інтарэсамі суседа. Я прапаноўвала высветліць адносіны ў судзе, але чытач пакінуў без увагі прапанову і працягваў далей маляваць слоўны партрэт свайго бесчалавечнага суседа. На маё пытанне, ці спрабаваў ён вырашыць праблему па-добраму, па-суседску, мой суразмоўца нават разлаваўся: «Мы ўжо даўно размаўляем толькі мацюкамі». Што да гэтага можна дадаць? Такім бакам і ў суд ісці не варта, а то іх выставяць чаго добрага за дзверы па прычыне непрыстойных паводзін.

У сваіх узаемных прэтэнзіях, асабліва за кавалак зямлі, людзі часта даходзяць да крайняй ступені нянавісці, нецярпімасці і нават слухаць не хочуць пра нейкія людскія шляхі вырашэння праблемы. І тут ужо ніводзін суд не дапаможа. Што б суд ні вырашыў, бакі будуць стаяць на сваім. Такі прыклад давялося бачыць на восеньскім прыёме грамадзян губернатарам у Жабінцы. На прыём прыйшоў 80-гадовы гараджанін з вялікай папкай дакументаў. Яго спрэчка з 90-гадовай суседкай за паўметра зямлі доўжыцца не адзін год. Пенсіянер прайшоў усе інстанцыі, у тым ліку судовыя. Ён лічыць, што яго падманулі, што калі рабілі новыя дакументы, беспадстаўна адмералі тыя паўметра і прыпісалі суседцы. Па дакументах жа выходзіць інакш. Акрамя гэтага, заяўнік скардзіўся на аднаго з абласных чыноўнікаў, у якога ён ужо пабываў. Той нібыта сказаў: «Вам, Іван Іванавіч, ужо пра душу думаць варта, а вы за аршын зямлі ваюеце». На гэтую скаргу і старшыня аблвыканкама, і ўсе прысутныя на прыёме красамоўна прамаўчалі. Няцяжка здагадацца, што падумаў кожны, хто знаходзіўся ў зале.

Пад Жабінкай, дарэчы, некалі жыў землеўладальнік Станіслаў Райскі. У завяшчанні сваім сынам ён напісаў аднойчы: «З дакументаў вы ўбачыце, колькі я дзеля спакою ўступіў зямлі сквапнаму суседу». І тады, як вядома, суды былі, але людзі ўмелі вырашаць спрэчкі па-суседску. Паноў з зямлі, за якую зараз ваююць, выгналі ў 1939-м, зямлю іх забралі, а шчаслівейшымі асобныя так і не сталі.

Святлана ЯСКЕВІЧ

Даты. Падзеі. Людзі

1848 год — нейкі Джэймс Маршал, які працаваў на лесапільні ў Каліфорніі, выпадкова знайшоў (літаральна пад нагамі) залаты злітак. Гэта паслужыла пачаткам каліфарнійскай залатой ліхаманкі. Тысячы людзей з усіх канцоў Амерыкі, а затым і ўсяго свету рынуліся ў Каліфорнію на пошукі золата. Некаторыя з іх сталі мільянерамі, але большасць — згалела. Каліфорнія спачатку прыйшла ў заняпад: усе дарослыя мужчыны кінулі сваю працу (з-за гэтага, у прыватнасці, збанкрутавала і лесапільня, на якой працаваў Джэймс Маршал). Нават Сан-Францыска цалкам апусцеў. Аднак прайшоў час, і каліфарнійскія гарады расцвілі дзякуючы велізарнаму прытоку насельніцтва. Няўдачлівыя золаташукальнікі сталі таннай рабочай сілай для мясцовых прадпрыемстваў, а тыя, хто ўсё ж такі знайшоў золата, укладвалі яго ў мясцовую эканоміку. Пачалося ператварэнне Каліфорніі ў штат мільянераў. Але гэта было потым, а сціплы рабочы Джэймс Маршал, які міжволі запусціў увесь гэты працэс, памёр у трухлявай хаціне. Сёння яму пастаўлены помнік — у тым месцы, дзе быў знойдзены першы самародак.



1904 год — 110 гадоў таму нарадзіўся (вёска Шутавічы, цяпер Смаргонскі раён Гродзенскай вобл.) Янка Шутовіч, беларускі грамадскі і культурны дзеяч, літаратуразнавец, кнігавыдавец. У 1935—1939 гадах быў выдаўцом і адказным рэдактарам літаратурна-навуковага часопіса «Каласы», у якім друкаваліся творы М. Танка, В. Таўлая, Я. Драздовіча і іншых аўтараў. Кіраваў сакратарыятам па справах беларускіх школ на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Пісаў артыкулы па пытаннях беларускай мовы, захавання помнікаў беларускай культуры. Выявіў у архіве рукапіс рамана М. Гарэцкага «Віленскія камунары». У 1944 г. быў рэпрэсаваны. Рэабілітаваны ў 1958-м. Памёр у 1973 годзе.

1931 год — нарадзіўся (вёска Мокрае Быхаўскага раёна Магілёўскай вобл.) Міхаіл Іосіфавіч Мушынскі, беларускі крытык, літаратуразнаўца, тэкстолаг, член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар філалагічных навук, прафесар. Аўтар больш за 250 навуковых прац у галіне гісторыі беларускай літаратуры, тэксталогіі, метадалогіі літаратуразнаўства і літаратурнай крытыкі. Даследаваў гісторыю беларускай крытыкі і літаратуразнаўства 1920—1960 гадоў. Адзін з аўтараў «Гісторыі беларускай дакастрычніцкай літаратуры» і «Гісторыі беларускай савецкай літаратуры» і іншых навуковых прац. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1980).

Было сказана

Уладзімір КАРАТКЕВІЧ, пісьменнік, паэт, публіцыст, кінасцэнарыст:

«Самая вялікая ўзнагарода, калі цябе хваляць тыя людзі, якім табе неяк не здарылася ў жыцці выпадку дапамагчы і зрабіць дабро. І самая вялікая бяда, калі цябе лае і ганьбіць той, каму тое дабро ты ўсё жыццё рабіў».

Чэмпіёны Сочы дапамогуць юным спартсменам

Сумесны праект Прэзідэнцкага спартыўнага клуба, Нацыянальнага алімпійскага камітэта, Міністэрства спорту і турызму «Алімпійскі выбар» працягнецца ў Сочы.

Нагадаем, што праграма па падтрымцы дзіцяча-юнацкага спорту ў нашай краіне стартавала на Алімпіядзе-2012 у Лондане. Тады пераможцы і прызёры Гульняў упершыню атрымалі магчымасць фінансава падтрымаць любую дзіцяча-юнацкую школу. Сумы спонсарскай дапамогі залежаць ад выніку спартсмена. Так, у Сочы яны складуць: за трэцяе месца — 50 млн руб., за другое — 75 млн руб. і за першае — 100 млн руб. Трэба адзначыць, што гэты праект дазваляе не толькі ўмацаваць матэрыяльна-тэхнічную базу дзіцяча-юнацкіх школ, але і наладзіць пераемнасць пакаленняў праз узаемадзеянне паміж чэмпіёнамі і юнымі спартсменамі.

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.

■ Здарэнні

Непрыемнасць на аўстрыйскай дарозе

Члены беларускай зборнай па біятлоне трапілі ў ДТЗ. Гэта адбылося ў Аўстрыі, паміж гарадамі Графенвер і Грундорф. Паводле паведамленняў мясцовых выратавальнікаў, мікрааўтобус з беларускай дэлегацыяй вывернуў на сустрэчную паласу і ўрэзаўся ў раздзяляльны бар'ер аўтабана. Члены каманды атрымалі лёгкія пашкоджанні і былі дастаўлены ў бальніцу, дзе ім аказалі медыцынскую дапамогу.

У машыне знаходзіліся старшы трэнер мужчынскай зборнай Алег Рыжанкоў, галоўны трэнер Беларускага клуба біятлона Андрэй Іеропес, урач каманды Павел Дрынеўскі і біятланіст Уладзімір Алянішка. Зараз усе члены зборнай знаходзяцца на запланаваным месцы збору і ўжо прыступілі да трэніровак.

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	9.09	17.35	8.26
Віцебск	9.04	17.19	8.15
Магілёў	8.59	17.25	8.26
Гомель	8.49	17.28	8.39
Гродна	9.23	17.51	8.28
Брэст	9.18	17.58	8.40

Месяц

Апошняя квадра ў 8.18.
Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Мікалая, Міхаіла, Уладзіміра, Фёдара.*
К. *Мілены, Роберта, Фелікса, Францішка, Цімафея.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА	-12..-10°С	КІЕЎ	-17..-15°С	РЫГА	-13..-11°С
ВІЛЬНЮС	-16..-14°С	МАСКВА	-16..-14°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	-8..-6°С

УСМІХНЕМСЯ

Сёння была на катку. Спачатку каталася на каньках, потым на каленях, затым — тварам па лёдзе. Цяпер вось на «хуткай» паеду катацца... Рух — гэта жыццё!

Дзеці — кветкі жыцця :)

Каця, 4 гады, яе бабуля адчытала. Стаіць у кутку і плача.

Падыходзіць дзядуля. І знарок строга:

— Што, бабуля пакрыўдзіла? Зараз я пайду і вушы ёй адарву!

Унучка (адразу спакайней):

— А завушніцы мне аддасі?..

Ніколі не ведаеш, адкуль чакаць дапамогі. Гумавая жанчына дапамагла таксісту Сідараву напампаваць кола.

Жонка — мужу:

— Дарагі, да нас прыйшло шмат гасцей, не хапае аднаго крэсла. Схадзі да суседзяў, пасядзі пакуль у іх.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 23.177. Індэкс 63850. Зак. № 318.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 23 студзеня 2014 года.